ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ПАНЯДЗЕЛАК, 30 МАЯ 1938 г. № 30 (372)

Цана 20 кап.

ЛІТАРАТУРА і МАСТАЦТВА

Орган праўлення Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР і Упраўлення па справах мастацтваў пры СНК БССР

РЫХТАВАЦЦА ДА ДЭКАДЫ БЕЛАРУСКАГА МАСТАЦТВА Ў МАСКВЕ

Велізарнейшая і пачэсная задача пастаўлена перад работнікамі мастацкага фронта Совецкай Беларусі. Бюро ЦК КП(б)Б і СНК БССР намецілі мерапрыемствы па падрыхтоўцы дэкады беларускага мастацтва ў Маскве ў 1939 годзе. Гэта рашэнне ўскалыхнула ўсю мастацкую грамадскасць рэспублікі.

Рад братніх саюзных рэспублік — Украіна, Грузія, Казахстан, Азербайджан ажыццявілі паказ дасягненняў свайго мастацтва ў Маскве, паказалі выдатныя ўзоры свайго нацыянальнага па форме, соцыялістычнага па зместу мастацтва і справядліва заслужылі высокую ацэнку працоўных Масквы, партыі і совецкага ўрада. І задача работнікаў мастацтваў Совецкай Беларусі састаіць у тым, каб на прадстаячай дэкадзе ў Маскве так паказаць росквіт соцыялістычнага мастацтва ордэнаноснай БССР, каб апраўдаць давер'е і дапамогу, якую аказвае беларускаму народу вялікі правадыр працоўных усяго свету таварыш Сталін.

Паказ беларускага мастацтва ў Маскве павінен з'явіцца дэманстрацыяй усіх творчых магчымасцей беларускага народа, квітнеючай Совецкай Беларусі, яе талентаў, дэманстрацыяй адданасці яе народа партыі Леніна—Сталіна.

Мастацтва глыбокімі караннямі звязана з усім жыццём народных мас нашай маладой і квітнеючай рэспублікі, звязана з ростам талентаў, якія ідуць з народа. Выяўленне гэтых талентаў, выяўленне лепшых узораў народнай творчасці павінна папярэднічаць усёй той рабоце тэатраў, кампазітараў, пісьменнікаў, якую яны правядуць, непасрэдна ствараючы вобразы аб гераічным мінулым і асабліва аб слаўным, шчаслівым сучасным беларускага народа.

Мы маем усе магчымасці для таго, каб на фронце мастацкай дзейнасці выйсці на ўзровень перадавых рэспублік вялікага Совецкага Саюза. Магчымасці нашы ў гэтай справе неабмежаваныя, яны закладзены ў творчых імкненнях беларускага народа, у той дапамозе, якую нам аказваюць народы братніх рэспублік і ў першую чаргу вялікі рускі народ, гэтыя магчымасці—у тых клопатах, якія праяўляе да вырошчвання кадраў комуністычная партыя і вялікі настаўнік і друг беларускага народа таварыш Сталін.

Усе магчымасці ў нас ёсць. Аднак, не ўсё яшчэ зроблена для таго, каб пышна квітнела наша мастацтва. Гэта добра выявілася на нарадзе, якую правяло Упраўленне па справах мастацтваў пры СНК БССР у парадку падрыхтоўкі да дэкады беларускага мастацтва ў Маскве. Начальнік Упраўлення тав. Патапейка інфарміраваў актыў работнікаў тэатра, кампазітараў і мастакоў аб мерапрыемствах, прынятых у сувязі з падрыхтоўкай да дэкады. Здзіўляе тое, што да гэтага часу намечаны толькі агульныя арганізацыйныя меры. Кожная задача можа быць на выдатна вырашана толькі тады, калі намечаны не толькі агульныя контуры, але і канкрэтызаваны важнейшыя дэталі, калі план намечан так, што відаць, хто і як яго будзе выконваць. Вось гэтага, нажаль, дагэтуль не мае Упраўленне па справах мастацтваў.

Безумоўна, вядучую ролю ў паказе беларускага мастацтва павінен адыграць Тэатр оперы і балета і беларуская Філармонія. Тэатр оперы і балета яшчэ не мае ні аднаго спектакля, з якім можна было-б выступіць у Маскве. Над операмі «Міхась Падгорны» і «Дрыгва» і балетам «Салавей» тэатр толькі пачынае працаваць. Да адной з важнейшых опер пра сучаснае жыццё Совецкай Беларусі, як пагранічнай рэспублікі,—«Пагранічнікі» яшчэ толькі пішацца лібрэта.

Мастацкае кіраўніцтва тэатра не здольна забяспечыць пастаноўкі спектакляў на высокім ідэйна-мастацкім узроўні. Ні кіраўніцтва тэатра, ні Упраўленне па справах мастацтваў не могуць даць адказу на самыя хвалюючыя пытанні. Хто будзе ставіць напісаныя беларускімі кампазітарамі оперы? Як будуць папоўнены аркестр, хоры і балет? Якую тэатр атрымае дапамогу, каб з гонарам справіцца з пачэснай задачай і заняць вядучае месца на мастацкім фронце?

Непадрыхтаванасць Тэатра оперы і балета да такой пачэснай работы, як паказ беларускага мастацтва ў Маскве,—не адзіны прыклад. Сярод кампазітараў, з якіх, праўда, вылучыўся рад здольных работнікаў, ёсць яшчэ элементы групаўшчыны, адарванасці ад тэатральнай і пісьменніцкай грамадскасці, што перашкаджае дружнай творчай калектыўнай рабоце.

На нарадзе гэтыя пытанні знайшлі сваё адлюстраванне. Большая частка выступаючых ускрыла тыя недахопы, якія перашкаджаюць разгортванню вялікай творчай работы нашых тэатраў, кампазітараў, мастакоў. Але мала ўвагі нарада аддала непасрэдным творчым пытанням.

Раздаваліся на нарадзе галасы, што з-за непадрыхтаванасці трэба на нейкі час адкласці паездку ў Маскву. Гэтыя няправільныя, па сутнасці песімістычныя, выказванні не атрымалі патрэбнага адпору. Зразумела, ёсць яшчэ шмат прабелаў і недахопаў, але мы маем усе магчымасці ліквідаваць перашкоды, якія тармозяць развіццё беларускага мастацтва. Мы маем здольных, таленавітых людзей, працуючых на гэтым участку культурнага фронта. Тэатр, кампазітары, пісьменнікі, мастакі Совецкай Беларусі перад такой пачэснай і важнай задачай, як паказ беларускага мастацтва ў сталіцы СССР, зробяць усё магчымае. Актывізуецца ўвесь багаты калектыў і велізарнейшай важнасці задача можа быць выканана з гонарам.

Усведамленне недахопаў ні ў якім разе не павінна быць повадам для песімістычных вывадаў. Наадварот. Бачачы слабыя, адсталыя бакі мастацкай работы, мы павінны накіраваць усе сілы на іх выпраўленне. Часу для правядзення дэкады засталося небагата. Досыць агульных нарад, сходаў, досыць агульных слоў і папрокаў. Патрэбна непасрэдная творчая работа. Упраўленне па справах мастацтваў ужо зараз павінна скласці канкрэтны, дзелавы план дэкады. Трэба выявіць здольных людзей, адмесці ўсіх тых, хто перашкаджае ці няздольны выявіць сілы і магчымасці беларускага мастацтва. І ў першую чаргу гэта работа павінна пачацца з апарата самога Упраўлення. На нарадзе на ўсе лады скланяліся імёны работнікаў Упраўлення, якія няздольны ўзначаліць творчую працу мастацкіх калектываў. Нямала няздольных работнікаў ёсць і ў саміх тэатрах. Гаварылася не раз аб тым, што ў Тэатры оперы і балета фактычна няма мастацкага кіраўніцтва. Трэба вылучыць для кіруючай работы і для непасрэднай работы ў тэатрах новых, здольных людзей. Галоўнае ў людзях, у падборы кадраў,—вучыў нас таварыш Сталін.

Не меншая задача састаіць у тым, каб неадкладна былі прыняты ўсе меры для збірання беларускага фальклору, мінулага і сучаснага. Неабходна таксама стварыць для тэатраў, кампазітараў, Філармоніі ўсе ўмовы для разгортвання творчай працы па падрыхтоўцы да дэкады. Аднак, нельга гэтай працы адрываць ад той непасрэднай арганічнай работы, якую вядуць мастацкія калектывы. На нарадзе раздаваліся няправільныя галасы аб тым, што патрэбна спыніць зараз выступленні тэатраў і заняцца падрыхтоўкай да дэкады. Гэта зусім няправільная думка. Работа тэатраў павінна быць шчыльна звязана з масамі, з гледачом і асабліва гэта важна зараз, у часе падрыхтоўкі да дэкады.

Справа гонару работнікаў усіх мастацтваў БССР правесці гэту вялікую і важную работу. Справа гонару паставіць падрыхтоўку так, каб беларускае мастацтва атрымала высокую ацэнку братніх народаў СССР і працоўных роднай Масквы. Работнікі мастацтваў сваю задачу выканаюць поўнасцю, калі работа будзе высока ацэнена партыяй, урадам і вялікім правадыром усіх працоўных, першым кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР—таварышам Сталіным.

За большэвіцкую падрыхтоўку да дэкады беларускага мастацтва ў Маскве!

В. Корзун

ПЕРШЫ ДЭПУТАТ

Гордасцю нязнанай
Наш настрой узняты.
Радасць сэрца поўніць,
Б'е праз берагі:

У Совет Вярхоўны
Першым дэпутатам
Будзе родны Сталін,
Блізкі, дарагі.

Сталін — дэпутат наш!
Ён — тварэц закона,
Ён адкрыў да шчасця
Нам шырокі шлях;

Пад яго наглядам
Расцвітае сёння
І красуе пышна
Родная зямля.

Пад яго наглядам,
Мудрым, клапатлівым,
Мы ў сям'і адзінай
Дружна зажылі.

І нясуцца песні
Аб жыцці шчаслівым
Па ўсёй совецкай
Сонечнай зямлі.

Гордасцю нязнанай
Сэрцы нашы поўны:
Беларусь Совецкая
Будзе выбіраць

Першым дэпутатам
У Совет Вярхоўны
Дарагога друга
І правадыра!

Таварыш І. В. СТАЛІН ЗАРЭГІСТРАВАН КАНДЫДАТАМ У ДЭПУТАТЫ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА РСФСР

Разгледзеўшы паступіўшыя ў Акруговую выбарчую камісію дакументы аб вылучэнні кандыдатур у дэпутаты Вярхоўнага Совета РСФСР, Акруговая выбарчая камісія Сталінскай выбарчай акругі гор. Масквы пастанавіла: зарэгістраваць для балатыроўкі ў дэпутаты Вярхоўнага Совета РСФСР па Сталінскай выбарчай акрузе № 2 гор. Масквы выстаўленую агульнымі сходамі рабочых, работніц, інжынераў, тэхнікаў і служачых заводаў: аўтатрактарнага электраабсталявання № 1, электралямпавага, трансфарматарнага імя Куйбышэва, машынабудаўнічага, завода цвёрдых сплаваў, завода імя Фрунзе, пражэктарнага завода імя Л. М. Кагановіча, электраматорнага завода імя Лепсе, на якіх прысутнічала 34.200 чалавек, кандыдатуру ў дэпутаты Вярхоўнага Совета РСФСР таварыша Іосіфа Вісарыёнавіча Сталіна.

Таварыш В. М. МОЛАТАЎ ЗАРЭГІСТРАВАН КАНДЫДАТАМ У ДЭПУТАТЫ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА РСФСР

Разгледзеўшы паступіўшыя ў Акруговую выбарчую камісію дакументы аб вылучэнні кандыдатур ў дэпутаты Вярхоўнага Совета РСФСР, Акруговая выбарчая камісія Молатаўскай выбарчай акругі горада Масквы пастанавіла: зарэгістраваць для балатыроўкі ў дэпутаты Вярхоўнага Совета РСФСР па Молатаўскай выбарчай акрузе № 3 горада Масквы, выстаўленую агульнымі сходамі рабочых, служачых і інжынерна-тэхнічных работнікаў завода «Точизмеритель» імя В. М. Молатава, фабрыкі імя Клары Цэткін, завода «Манометр», маскоўскага газавага завода, фабрыкі «Москвошвей» № 1 імя Комінтэрна і паравознага дэпо Масква-1, чыгункі імя Ф. Э. Дзержынскага, на якіх прысутнічала 13.760 чалавек, кандыдатуру ў дэпутаты Вярхоўнага Совета РСФСР таварыша Вячэслава Міхайлавіча Молатава.

Таварыш І. В. СТАЛІН ЗАРЭГІСТРАВАН КАНДЫДАТАМ У ДЭПУТАТЫ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА КАЗАХСКАЙ ССР

Акруговая выбарчая камісія Сталінскай выбарчай акругі № 6 горада Алма-Ата, разгледзеўшы паступіўшыя дакументы аб вылучэнні кандыдатаў у дэпутаты Вярхоўнага Совета Казахскай ССР, зарэгістравала для балатыроўкі выстаўленую агульнымі сходамі рабочых, служачых і інжынерна-тэхнічных работнікаў друкарні № 2 Казахскага дзяржаўнага выдавецтва, будаўнічай канторы Упраўлення па справах мастацтваў пры СНК Казахскай ССР, упраўлення Турксіба і прафесароў, выкладчыкаў, студэнтаў і служачых медыцынскага інстытута імя Молатава, інстытута марксізма-ленінізма, на якіх прысутнічала 2.762 чалавекі, — кандыдатуру ў дэпутаты Вярхоўнага Совета Казахскай ССР таварыша **Іосіфа Вісарыёнавіча СТАЛІНА.**

ВЯЛІКАЯ СІЛА ЛЮБВІ ДА РАДЗІМЫ

ПРАМОВА ПІСЬМЕННІКА ЗМІТРАКА БЯДУЛІ НА АБ'ЯДНАНЫМ ПЕРАДВЫБАРЧЫМ СХОДЗЕ СТАЛІНСКАЙ ВЫБАРЧАЙ АКРУГІ гор. МЕНСКА

(Прысутнічала 5 тысяч чалавек).

З кожным днём набліжаецца радасная, шчаслівая дата — 26 чэрвеня — тая дата, калі кожны з нас з пачуццём вялікага ўздыму аддасць свой голас за найлепшых з лепшых сыноў і дачок нашай любімай соцыялістычнай радзімы, тая дата, калі кожны з нас будзе выбіраць дэпутатаў у Вярхоўны Совет БССР.

У дні выбараў Вярхоўных Советаў рэспублік на шостай частцы зямлі — ва ўсім рознакліматным і рознанародным па мове Саюзе Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік — кожны сын, кожная дачка вялікай 170-мільённай совецкай сям'і, у шчыльным і магутным блоку комуністаў і беспартыйных, — усе, як адзін чалавек, будуць выбіраць дастойных кіраўнікоў соцыялістычных рэспублік.

Наша радзіма бяскрайна вялікая, бязмерна багатая. Наша радзіма ператорана гераічнай, мудрай партыяй Леніна—Сталіна з пустэчы, якую пакінулі нам капіталісты, у квітнеючы сад соцыялістычнай будовы. Народы, якія доўгімі вякамі гібелі пад царскім гнётам, ператварыліся ў адзін гераічны совецкі народ з багатай культурай, з небывалай індустрыяй. Прыгнечаныя раней рабочыя і працоўныя сяляне сталі новымі людзьмі — культурнымі і шчаслівымі.

Пад кіраўніцтвам партыі Леніна—Сталіна мільённыя, раней непісьменныя, масы знаходзяцца цяпер на самай вяршыні совецкай культуры — перадавой культуры свету.

Мы — новыя людзі, з новымі пачуццямі.

Любоў да радзімы ў нас неахопная, як мора. Кожны з нас у любы момант гатоў аддаць жыццё за любы куток совецкай зямлі — ці то на поўначы, ці то на поўдні.

Кожны куток нашай вялікай совецкай зямлі з'яўляецца родным кожнаму з нас.

Кожны з нас — дома ў любой рэспубліцы. Мы ўсе — адна вялікая 170-мільённая сям'я.

У гэтым, таварышы, вялікая сіла любві да радзімы.

Такое высокае пачуццё — небывалае ў гісторыі. Гэта невыразімае шчасце.

І не дзіва, што на шырокіх прасторах неабдымнай совецкай радзімы вялікі рознамоўны совецкі народ складае радасныя песні пра шчаслівае жыццё, пра Сталінскую Канстытуцыю, пра любімага бацьку і настаўніка нашага — таварыша Сталіна і пра слаўных яго саратнікаў — таварышоў Варашылава, Ежова, Молатава.

І мы ўпэўнены, што калі надыйдзе патрэбная хвіліна, мы ўсе, як адзін, возьмем у рукі вінтоўкі і пойдзем біць ворага на яго-ж тэрыторыі! І мы пераможам!

Таварышы! Многія з вас памятаюць, якая была Беларусь да Кастрычніка. Беларусь была цёмная, дзікая, непісьменная. Памешчыкі па-звярынаму эксплаатавалі бязлітасна. Народы Беларусі адурманьваліся зграяй папоў і рабінаў, чорнасоценным царскім чыноўніцтвам.

Беларускі народ неаднаразова на працягу мінулых вякоў узнімаў сцяг барацьбы супроць адвечных сваіх душыцеляў — польскіх памешчыкаў і магнатаў, як і супроць царызма. Але толькі Вялікі Кастрычнік і дапамога братняга рускага народа вызваліла Беларусь ад соцыяльнага і нацыянальнага прыгнёту.

Тут, у Беларусі, змагаліся за волю, аддавалі жыццё працоўныя з усяго СССР.

Дзесяткі і сотні тысяч аддавалі ў Беларусі жыццё за тое шчасце, за тую будучыню, што такімі яркімі і сонечнымі літарамі запісаны ў Сталінскай Канстытуцыі.

Беларусь, як і родныя сёстры яе — совецкія соцыялістычныя рэспублікі, цяпер зусім новая зямля, з новымі, шчаслівымі людзьмі.

Выбары дэпутатаў у Вярхоўны Совет БССР — падзея, небывалая ў нашай гісторыі. Гэта — шчаслівы і радасны дзень для ўсіх працоўных Беларусі.

Дазвольце мне, таварышы, ад імя пісьменніцкай грамадскасці гор. Менска далучыць свой голас да прапановы аб вылучэнні першымі кандыдатамі ў дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР правадыра працоўных усяго свету, тварца беларускай дзяржаўнасці, тварца сонечнай Канстытуцыі, нашага бацьку і настаўніка, роднага і любімага Іосіфа Вісарыёнавіча Сталіна.

Беларускі народ ніколі не забудзе штодзённай увагі і клопатаў Іосіфа Вісарыёнавіча аб нашай Совецкай Беларусі. Беларускі народ заўсёды будзе ўдзячны яму за тое, што ён дапамог ачысціць нашу зямлю ад трацкісцка-бухарынскай і нацыянал-фашысцкай погані.

Дазвольце далучыць таксама свой голас да прапановы аб вылучэнні кандыдатамі ў дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР адданых змагароў за справу комунізма, слаўных саратнікаў вялікага Сталіна — таварышоў Молатава, Вячэслава Міхайлавіча, Варашылава, Кліменція Ефрэмавіча і Ежова, Нікалая Іванавіча.

Дазвольце таксама падтрымаць прапанову аб вылучэнні кандыдатуры сакратара Сталінскага раённага камітэта партыі — тав. Смоляра.

Будзем прасіць кіраўнікоў комуністычнай партыі балатыравацца ў нас.

Таксама будзем прасіць тав. Смоляра даць сваю згоду балатыравацца ў нас.

Няхай жыве сталінскі непераможны блок партыйных і беспартыйных!

Няхай жыве ленінска-сталінская Комуністычная Партыя!

Няхай жыве вялікі совецкі народ!

Няхай жыве мудры ваўдзіцель магутнай Чырвонай Арміі тав. Варашылаў!

Няхай жыве сталінскі нарком, жалезны вартаўнік совецкіх граніц — тав. Ежоў!

Няхай жыве верны саратнік вялікага Сталіна — тав. Молатаў!

Няхай жыве наш любімы правадыр, настаўнік, родны бацька — Іосіф Вісарыёнавіч Сталін!



Міхась Ціхонавіч ЛЫНЬКОЎ — старшыня праўлення Саюза Совецкіх пісьменнікаў БССР — кандыдат у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР па Суражскай выбарчай акрузе.



Анатолі Васільевіч БАГАТЫРОЎ — кампазітар—кандыдат у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР па Варашылаўскай выбарчай акрузе горада Менска.

ПАСТАНОВА

АКРУГОВАЙ ВЫБАРЧАЙ КАМІСІІ СУРАЖСКАЙ ВЫБАРЧАЙ АКРУГІ № 60 ПА ВЫБАРАХ У ВЯРХОЎНЫ СОВЕТ БССР АБ РЭГІСТРАЦЫІ КАНДЫДАТА У ДЭПУТАТЫ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БССР ТАВАРЫША

Міхася Ціхонавіча ЛЫНЬКОВА

Разгледзеўшы паступіўшыя ў Акруговую выбарчую камісію дакументы аб вылучэнні кандыдатур у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР, Акруговая выбарчая камісія, устанавіўшы поўную адпаведнасць прадстаўленых дакументаў з артыкуламі 48, 49, 50, 51 і 52 «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет БССР», ПАСТАНАВІЛА:

На падставе артыкула 52 «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет БССР» зарэгістраваць для балатыроўкі ў дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР па Суражскай выбарчай акрузе № 60 выстаўленую перадвыбарчымі агульнымі сходамі фабрыкі імя Вароўскага, Райпрамкамбіната, Новаалександраўскага ільнозавода, Суражскага ільнозавода, калектыва настаўнікаў, калгасаў «Перамога», імя Крупскай, імя Сталіна, «Новы быт», «Чэлюскін» і іншыя, на якіх прысутнічала тры тысячы чалавек, — кандыдатуру ў дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР таварыша Міхася Ціхонавіча ЛЫНЬКОВА, нараджэння 1899 года, члена КП(б)Б, старшыню Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР, пражываючага ў гор. Менску.

На падставе артыкула 57 «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет БССР» уключыць кандыдатуру тав. Лынькова Міхася Ціхонавіча ў выбарчы бюлетэнь па Суражскай выбарчай акрузе № 60.

У адпаведнасці з артыкулам 56 «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет БССР» пастанову апублікаваць да ўсеагульнага ведама.

Старшыня акруговай выбарчай камісіі МАНЮК.

Намеснік старшыні МАЛЯЎСКАЯ.

Сакратар БУЦЭЛЬ.

Члены камісіі: МЯДЗВЕДЗЕЎ, КАЛІНА, ЯКАЎЛЕВА, ШАМАТУЛЬСКАЯ, СЕЛЕЗНЕЎ, ВАСІЛЬЕЎ.

ПАСТАНОВА

АКРУГОВАЙ ВЫБАРЧАЙ КАМІСІІ ВАРАШЫЛАЎСКАЙ ВЫБАРЧАЙ АКРУГІ № 162 ГОРАДА МЕНСКА ПА ВЫБАРАХ У ВЯРХОЎНЫ СОВЕТ БЕЛАРУСКАЙ ССР АБ РЭГІСТРАЦЫІ КАНДЫДАТА У ДЭПУТАТЫ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БССР ТАВАРЫША

Анатолія Васільевіча БАГАТЫРОВА

Разгледзеўшы паступіўшыя ў акруговую выбарчую камісію дакументы аб вылучэнні кандыдатур у дэпутаты Вярхоўнага Совета Беларускай ССР, акруговая выбарчая камісія, устанавіўшы поўную адпаведнасць прадстаўленых дакументаў з артыкуламі 48, 49, 50, 51 і 52 «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет БССР», пастанавіла:

На падставе артыкула 52 «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет Беларускай ССР» зарэгістраваць для балатыроўкі ў дэпутаты Вярхоўнага Совета Беларускай ССР па Варашылаўскай выбарчай акрузе № 162 горада Менска выстаўленую перадвыбарчымі сходамі рабочых, інжынераў, тэхнікаў і служачых дрэваапрацоўчага завода імя Молатава, завода ланцугоў Галля, трамвайнага парка, фабрыкі імя 8 сакавіка, студэнтаў, настаўнікаў, рабочых і служачых тэхнікума электрасувязі, байцоў, камандзіраў і палітработнікаў Н-скіх часцей, на якіх прысутнічала 5.000 чалавек, — кандыдатуру ў дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР тав. Анатолія Васільевіча БАГАТЫРОВА, нараджэння 1913 года, беспартыйнага, кампазітара, пражываючага ў гор. Менску.

На падставе артыкула 57 «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет БССР» уключыць кандыдатуру тав. Багатырова Анатолія Васільевіча ў выбарчы бюлетэнь па Варашылаўскай выбарчай акрузе № 162 горада Менска.

У адпаведнасці з артыкулам 56 «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет БССР» пастанову апублікаваць да ўсеагульнага ведама.

Старшыня акруговай выбарчай камісіі В. КРАЎЦОЎ.

Намеснік старшыні І. СМОЎЖЭНКА.

Сакратар І. АНОШЫН.

Члены камісіі: А. СТРАМОК, Т. ПЯТРОВІЧ, І. КАГАН, М. ЛЕВІН, С. СОСНЕР.

26 мая 1938 г., Менск.

КАНДЫДАТЫ БЛОКА КОМУНІСТАЎ І БЕСПАРТЫЙНЫХ

Па выбарчых акругах БССР заканчваюцца перадвыбарчыя сходы рабочых, калгаснікаў, працоўнай інтэлігенцыі, на якіх вылучаюцца кандыдаты ў дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР. З вялікай радасцю, у шчыльным блоку комуністаў і беспартыйных, вылучае беларускі народ у вярхоўны орган улады сваёй рэспублікі лепшых сыноў соцыялістычнай радзімы.

Пачуццём палкага совецкага патрыятызма, бязмежнай адданасці і любві да большэвіцкай партыі і роднага Сталіна прасякнуты ўсе перадвыбарчыя сходы.

Працоўныя БССР з выключнай аднадушнасцю вылучылі кандыдатамі ў дэпутаты Вярхоўнага Совета рэспублікі мудрага і любімага правадыра народаў таварыша **Іосіфа Вісарыёнавіча Сталіна** і слаўных сталінскіх саратнікаў.

Лепшых, адданейшых сыноў народа і партыі вылучаюць працоўныя БССР у вярхоўны орган улады рэспублікі.

Сярод кандыдатаў — кіраўнікі партыі і ўрада БССР — таварышы **А. А. Волкаў, А. М. Лявіцкі, Н. Я. Наталевіч, А. Ф. Кавалёў, Б. Д. Берман.**

Сярод кандыдатаў — ініцыятар стаханаўскага руху на менскім заводзе імя Кірава, рабочы-каваль **А. П. Ціханаў,** брыгадзір трактарнай брыгады Козінскай МТС на Мазыршчыне **Н. П. Баброў,** стаханаўка-трактарыстка Лупалаўскай МТС **Е. М. Аляксейчыкава,** рабочы-стаханавец, ордэнаносец **П. Я. Сабіла** (Чыгуначная выбарчая акруга гор. Менска), стаханаўка Рэчыцкай запалкавай фабрыкі, работніца сартыровачнага цэха **А. М. Бахта,** малады інжынер Оршанскага ільнокамбіната **М. А. Сцяпанава,** стаханаўка Лагойскай МТС **С. У. Міклашэўская,** даярка-ордэнаносец соўгаса «Зарэчча» (Плісская выбарчая акруга) **Ф. М. Шамко,** работніца-стаханаўка швейнай фабрыкі імя Валадарскага ў Магілеве **А. І. Акулёнак,** стаханаўка — звенявая калгаса «Завет Ільіча» **Н. Г. Міцкевіч** (Шклоўская сельская выбарчая акруга), сакратар аргкамітэта ЦК КП(б)Б па Менскай вобласці **А. П. Матвееў,** сакратар Кагановіцкага райкома партыі **П. П. Савіцкі,** сакратар Сталінскага райкома КП(б)Б тав. **В. П. Смоляр,** сакратар аргкамітэта ЦК КП(б)Б па Палескай вобласці **Д. Ф. Маркін,** сакратар Магілеўскага гаррайкома КП(б)Б **Р. Я. Шуб,** старшыня Віцебскага гарсовета **М. І. Багрыноўскі,** палітрук Н-скай часці **А. С. Казлоў** (Калінінская выбарчая акруга гор. Менска), дырэктар менскай абутковай фабрыкі імя Кагановіча **В. П. Платонаў,** дырэктар Магілеўскай шоўкавай фабрыкі імя Куйбышава **М. Н. Шэвелеў,** настаўнік Рэчыцкага педвучылішча **І. К. Якімовіч** і інш.

Кандыдатамі ў дэпутаты соцыялістычнага парламента БССР вылучаны лепшыя людзі краіны, палкія совецкія патрыёты, верныя сыны і дочкі партыі і народа.

Справа гонару ўсіх партыйных, прафсаюзных, комсамольскіх арганізацый, работнікаў літаратуры і мастацтваў — шырока разгарнуць агітацыю за кандыдатаў сталінскага блока комуністаў і беспартыйных.

ДА ЎСІХ РАБОТНІКАЎ МАСТАЦТВАЎ, ПІСЬМЕННІКАЎ, УДЗЕЛЬНІКАЎ МАСТАЦКАЙ САМАДЗЕЙНАСЦІ, НАВУЧАЮЧЫХСЯ У МАСТАЦКІХ НАВУЧАЛЬНЫХ УСТАНОВАХ БССР

Са звароту актыва работнікаў мастацтваў БССР

ДАРАГІЯ ТАВАРЫШЫ!

Дні вялікай радасці і шчасця перажывае беларускі народ у дружнай сям'і народаў Савецкага Саюза, рыхтуючыся да выбараў у Вярхоўны Совет сваёй ордэнаноснай рэспублікі.

У гэтыя гістарычныя дні беларускі народ з глыбокай адданасцю, з вялікай любоўю і ўдзячнасцю яшчэ шчыльней згуртоўваецца вакол вялікай партыі Леніна—Сталіна, вакол любімага правадыра перадавога чалавецтва — вакол нашага бацькі і друга, роднага Сталіна, які даў беларускаму народу дзяржаўнасць, прывёў беларускі народ да шчаслівага і радаснага жыцця.

З пачуццём глыбокага хвалявання сустрэлі мы, удзельнікі Усебеларускай нарады актыва работнікаў мастацтваў, як і ўвесь беларускі народ, паведамленне аб тым, што правадыр народаў таварыш Сталін і верныя яго саратнікі — слаўныя сталінцы таварышы Молатаў, Кагановіч, Варашылаў, Калінін, Ежоў, Мікаян, Андрэеў і Жданаў далі згоду балатыравацца ў дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР.

У гэтыя дні падвойную радасць перажываюць работнікі культуры і мастацтваў БССР у сувязі з пастановай бюро ЦК КП(б)Б і СНК БССР аб падрыхтоўцы да дэкады беларускага савецкага мастацтва ў Маскве.

Выбары ў соцыялістычны парламент БССР, падрыхтоўка да дэкады, якая з'явіцца дэманстрацыяй росквіту соцыялістычнага мастацтва беларускага народа, натхняюць увесь беларускі народ і клічуць нас, мастакоў Савецкай Беларусі, стварыць творы мастацтва, вартыя быць паказанымі ў сталіцы нашага Саюза кіраўнікам партыі і ўрада, лепшаму другу беларускага народа вялікаму Сталіну.

Рыхтуючыся да дэкады, якая з'явіцца святам беларускага савецкага мастацтва, мы абавязаны цвёрда памятаць, што мы, работнікі культуры і мастацтваў БССР, у вялікім даўгу перад партыяй, урадам і народамі нашай радзімы. Мы яшчэ не стварылі паўнацэнных твораў, праўдзіва, глыбока і высокамастацка адлюстроўваючых гераічныя старонкі барацьбы нашай партыі за справу комунізма, за вызваленне беларускага народа, за яго шчаслівае сёння і яшчэ больш радаснае заўтра.

Такія хвалюючыя тэмы, як сталінская дружба народаў, пытанні большэвіцкай пільнасці, ахова нашых свяшчэнных граніц, атрыманне беларускім народам сваёй дзяржаўнасці, роля Леніна і Сталіна ў стварэнні беларускай соцыялістычнай дзяржавы, роля спадвіжнікаў Леніна і Сталіна — таварышаў Фрунзе, Орджанікідзе, Кагановіча, Ежова ў справе барацьбы за стварэнне соцыялістычнай Савецкай Беларусі яшчэ не знайшлі патрэбнага адлюстравання ў нашым мастацтве.

Справай гонару ўсіх нас, кожнага калектыва, работнікаў мастацтваў, пісьменнікаў, удзельнікаў мастацкай самадзейнасці, навучаючыхся ў мастацкіх школах — творчай работай папоўніць гэты прабел, забяспечыўшы далейшы нябачаны росквіт савецкага беларускага мастацтва.

Мы клічам усіх работнікаў мастацтваў БССР у сваёй штодзённай творчай рабоце цвёрда памятаць аб бязмежных магчымасцях, дадзеных нам партыяй, урадам, савецкім народам для стварэння класічных твораў соцыялістычнага мастацтва.

Пісьменнікі Савецкай Беларусі, мы заклікаем вас у дружнай рабоце з намі стварыць п'есы, сцэнарыі, лібрэта, песні, вартыя нашай цудоўнай сталінскай эпохі.

Артысты, рэжысёры Савецкай Беларусі, арганізуйце соцыялістычнае спаборніцтва калектываў, цэхаў і асобных работнікаў за вартае сцэнічнае ўвасабленне вялікіх і хвалюючых тэм і вобразаў нашага жыцця і барацьбы.

Мастакі, кампазітары, — у палотнах, сімфоніях, песнях слаўце вялікую партыю Леніна—Сталіна, яе правадыроў, слаўце наш народ і яго герояў.

Шматтысячная армія ўдзельнікаў мастацкай самадзейнасці, выразіце вашым мастацтвам глыбокую радасць, думкі, пачуцці шчаслівага беларускага народа, выдзеліце з свайго асяроддзя самыя яркія таленты, якімі так багат наш народ, дасканала рыхтуйцеся да вялікага свята — дэкады.

Няхай падрыхтоўка да дэкады з'явіцца стымулам для ўзняцця ўзроўню ўсяго фронта мастацтваў БССР.

І зараз задача ўсіх работнікаў мастацтваў БССР, рыхтуючыся да дэкады беларускага мастацтва, па-баявому ліквідаваць вынікі шкодніцтва, нанесенага ворагамі народа на фронце мастацтва, і паказаць у сусветнай сталіцы — Маскве лепшаму другу беларускага народа вялікаму Сталіну, як пад яго кіраўніцтвам ліквідуюцца вынікі шкодніцтва, як вырасла, расце і квітнее мастацтва беларускага народа, нацыянальнае па форме, соцыялістычнае па зместу.

Будзем дабівацца і даб'емся далейшага росквіту соцыялістычнага мастацтва Савецкай Беларусі пад сцягам партыі Леніна—Сталіна.

Узнімем наша мастацтва да ўзроўню лепшых узораў мастацтва Саюза ССР! Зробім яго вартым эпохі вялікага Сталіна!

Няхай жыве вялікая партыя Леніна—Сталіна, арганізатар і натхніцель нашых соцыялістычных перамог!

Няхай жыве наш вялікі правадыр, вялікі Сталін!

ТЭАТР, НАРОДЖАНЫ РЭВОЛЮЦЫЯЙ

(Да гастроляй Маскоўскага тэатра Рэволюцыі ў Менску).

Цікавы і шматгранны творчы шлях Маскоўскага тэатра Рэволюцыі. У гэтым годзе тэатр адзначае пятнаццатую гадавіну сваёй работы.

Арганізаваны Маскоўскім камітэтам партыі і Моссоветам, тэатр адразу-ж стаў яркім звяном на фронце мастацтва, вырас у адзін з буйнейшых сталічных калектываў, любімых як гледачом пролетарскай сталіцы, так і працоўнымі братніх рэспублік, куды тэатр выязджаў на гастролі.

У чым-жа асаблівасць гэтага мастацкага калектыва, за што яго любяць масы?

Рашэнне гэтага пытання трэба шукаць у тым, што Маскоўскі тэатр Рэволюцыі ніколі не быў шэрым, пасрэдным калектывам. Тэатр выхоўваў свае акторскія кадры ў духу рэалістычнага разумення мастацтва, перамажна змагаючыся на шляхах свайго росту як з фармалістычным напрамкам, уласцівым і гэтаму тэатру на першым этапе яго работы, так і супроць прымітыўнага натуралізма і халоднага эстэтызма. Тэатр Рэволюцыі любяць і цэняць за тое, што ён, працуючы над п'есамі рускай класічнай і савецкай драматургіі, над лепшымі п'есамі заходніх класікаў, заўсёды ствараў хвалюючыя, глыбока-эмацыянальныя спектаклі, змагаючыся за поўнацэнныя мастацкія вобразы, за глыбокую праўду жыцця.

Тэатр Рэволюцыі па-праву лічыцца калыскай савецкай драматургіі. Пятнаццаць год назад, калі пасля грамадзянскай вайны пачынала свой шлях савецкая драматургія, тэатр рашуча ўзяў курс на савецкага драматурга, на паказ твораў, адлюстроўваючых хвалюючыя тэмы рэволюцыйнай савецкай рэчаіснасці і барацьбы заходняга пролетарыята.

Да 20-й гадавіны Вялікай Кастрычніцкай рэволюцыі тэатр паставіў і паказаў працоўным Масквы і Ленінграда спектакль «Праўда» Карнейчука, на тэму аб вялікім Кастрычніку, ролі рабочага класа, партыі і вялікага Леніна ў кіраўніцтве Кастрычніцкім паўстаннем.

Тэатр, ствараючы спектаклі, вобраз В. І. Леніна, расшыраў рамкі савецкай тэматыкі і савецкай драматургіі, пракладаючы для ўсіх тэатраў і актораў шляхі да стварэння мастацкіх вобразаў Леніна, Сталіна, Варашылава і іншых вялікіх герояў нашага народа і нашага часу. У гэтым яшчэ раз значэнне нашай мастацкай работы.

За пятнаццаць год мастацка-творчага росту тэатр Рэволюцыі вылучыў рад таленавітых майстраў мастацтва і актораў на савецкую сцэну. Гэта заслужаныя артысты рэспублікі М. І. Бабанава, О. І. Пыжова, Ю. С. Глізер, Н. І. Іванова, Д. Н. Орлоў, М. М. Штраух, М. Ф. Астангаў, Г. В. Музалеўскі, А. В. Багданава. Побач з тым тэатр, маючы пры сабе вучылішча, вырасціў групу маладых, моцных і здольных актораў, да якіх неабходна аднесці Тэр-Осіпян, Бахарэва, Талмазава, Баташова, Белова, Енюціну, Маліноўскую, Альтоўскую і іншых.

У часе сваёй гастрольнай паездкі ў сталіцу Беларусі—Менск тэатр пакажа працоўным спектаклі «Рамео і Джульета»—Шэкспіра, «Праўда»—Карнейчука, «Сабака на сене»—Лопе дэ Вега, «Апошнія»—Горкага і інш. у асноўным складзе сваіх выканаўцаў. Адначасова тэатр будзе дапамагаць на месцах мастацкай тэатральнай самадзейнасці, бо культурна-масавая работа калектыва тэатра заўсёды лічылася неад'емнай часткай яго грамадска-палітычнага і мастацкага твару.

В. СОБАЛЕЎ.

Дырэктар Маскоўскага тэатра Рэволюцыі.

ЛІБРЭТА ОПЕРЫ „МІХАСЬ ПАДГОРНЫ" П. БРОЎКІ

З даклада тав. К. Крапівы на пленуме Саюза савецкіх пісьменнікаў БССР



Тав. П. БРОЎКА.

У аснову лібрэта «Міхась Падгорны» пакладзена змаганне двух лагераў. З аднаго боку—бядняк Міхась, яго каханая Марыся, Ганка—салдатка, Аніщчук, былы рабочы-пуцілавец, большэвік. Лагер беднаты супроцьстаўляецца кулацкаму лагеру, прадстаўнікамі якога з'яўляюцца Змітрок Закрэўскі, яго бацька—Ігнат, прапаршчык Агрызка і інш. Дзея адбываецца ў часы імперыялістычнай вайны. Дыханне вайны адчуваецца ўжо ў пачатку першай карціны—у поўнай смутку песні салдаткі Ганкі. Гэта песня дае эмацыянальную афарбоўку ўсёй карціне.

Гэты цяжар агульнага народнага гора ўзмацняецца асабістым горам Марысі, якую бацькі хочуць аддаць за нялюбага ёй кулака Закрэўскага, і горам Міхася, у якога Закрэўскі не толькі зямлю адабраў, але адбірае яшчэ і каханую жанчыну. Яго-ж самога бяруць у салдаты і гоняць на фронт абараняць нянавіснага яму цара і тую зямлю, якой у яго няма. Гэты асабісты і агульны смутак моцна падкрэсліваецца ў канцы карціны, калі хор пяе:

Хадзем і Міхася праводзім у дарогу,
Ні бацькі у яго, ні маткі, ні сястры...
Гора... Гора... Гора нам нясе вайна.

У другой карціне Марыся яшчэ ў большым смутку. У вёсцы пусцілі чуткі, што Міхась забіты. Цяпер у бацькоў Марысі ёсць усе падставы, каб аддаць яе за нялюбага ёй Змітрака Закрэўскага. Яна, прыгнечаная страшным горам — стратай любага чалавека, пад прымусам бацькоў выходзіць за Змітрака.

Смутак Марысі мог змяніцца не шчасцем. На вяселле прыходзіць Міхась, які прышоў на пабыўку параненым. Але абодва яны знаходзяцца ў такіх умовах, што не могуць ажыццявіць гэтага шчасця: Міхась павінен пасля выздараўлення вярнуцца зноў на фронт, а, па-другое, Марыся ў законным шлюбе з Змітраком і супроць бацькоўскай волі яна таксама не можа пайсці.

У трэцяй карціне пачаўся пералом: ад дэпрэсіі, ад вялікага смутку—да актыўных дзеянняў.

У новабранцаў паяўляецца ўсведамленне таго, што яны ідуць паміраць не за свае інтарэсы. Гэта-ж усведамляе і Міхась. Дапамагае яму ў гэтым Аніщчук. Гэта—спакойны, цвярозы голас. Спакойны не таму, што ён не хвалюецца за справу, а таму, што ён адчувае за сабою вялікую сілу, сілу комуністычнай партыі, таму, што ён ведае, куды гэта партыя вядзе, і верыць у перамогу. І гэты спакойны голас робіць моцны ўплыў на новабранцаў і на Міхася.

Лейтматывам трэцяй карціны з'яўляецца песня новабранцаў:

Бывайце, прасторы, радзімае поле,
Нам тут не гуляць і не пець...
Чужая нас воля, праклятая доля
На смерць пасылае, на смерць...

І ўжо ў чацвертай карціне, як вынік гэтага, мы бачым актыўныя дзеянні. Яны выражаюцца ў тым, што Міхась пачынае агітацыю сярод салдат, з якімі ён зараз знаходзіцца ў акопах, што гэтая агітацыя мае свой належны ўплыў, і калі хутка прывязюць туды арыштаванага Аніщчука, салдаты вызваляюць яго з-пад варты і даюць яму магчымасць схавацца. Міхась заклікае канчаць вайну імперыялістычную і ісці ваяваць з сваімі прыгнятальнікамі — панамі і капіталістамі.

У пятай і шостай карцінах падзеі бурна нарастаюць, аж пакуль не заканчваюцца перамогай лагера беднаты і падзелам панскай зямлі. Міхась цалкам аддаецца рэволюцыйнай барацьбе. У кругавароце падзей ён забываецца пра свае асабістыя справы, на момант як-бы забывае нават каханую жанчыну, Марыську. Лінія іх адносін, праўда, заканчваецца лагічна ў канцы 6-й карціны, калі Марыся канчаткова парывае з Закрэўскім і ідзе з Міхасём, але гэтаму моманту аддаецца аўтарам вельмі мала ўвагі і месца.

Коратка аб паасобных вобразах.

Марыся—простая вясковая дзяўчына; яна ўмее глыбока перажываць, яна моцна любіць Міхася; але ў яе нехапае сілы волі, каб перамагчы перашкоды і пайсці супроць жадання бацькоў.

Марыся больш ярка паказана ў першай, другой і трэцяй карцінах. У наступных карцінах яна застаецца ўсё тою-ж простаю і чулаю дзяўчынаю, якая можа адчуваць і глыбока перажываць, але ёй ужо няма дзе разгарнуцца, няма дзе выказаць свае пачуцці. Гэта крыху абядняе вобраз Марысі.

Ганка—сяброўка Марысі. У яе таксама вялікае гора, але яна больш мужна можа пераносіць сваё гора і можа аказаць дапамогу Марысі.

У лібрэта яна абрысавана скупымі, але праўдзівымі штрыхамі, кожнаму слову яе верыш. І калі яна гаворыць салдатам, якія прышлі ўціхамірыць сялян: «Каго збіраецеся біць, сваіх братоў і бацькоў?»—дык гэта робіць уплыў і на салдатаў, якія апусцілі вінтоўкі і не могуць страляць у народ, і на чытача.

Сярод іншых вызначаецца сваёй цэльнасцю вобраз Аніщчука. У ім яшчэ шмат сялянскай павольнасці і разважнасці, але ён ужо выгартаваў сваю волю ў рэволюцыйным рабочым асяроддзі. Ен цвёрда ведае, за што яму змагацца і што яму рабіць. Адсюль у яго вялікая ўпэўненасць, якая робіць яго словы важкімі і пераканаўчымі. Зусім натуральнае вяршэнне яго лініі ў тым, што ён у канцы паяўляецца як старшыня мясцовага рэўкома.

Міхась — гэта цэнтральны вобраз, але ён не такі цэльны, як Аніщчук. Лінія Міхася падзяляецца рэзка на дзве палові. У першай карціне ён моцна кахае дзяўчыну, здольны моцна перажываць, але, здавалася-б, не здольны актыўна дзейнічаць. Але, пачынаючы з 4-й карціны і да канца, мы бачым яго толькі як рэволюцыянера, як агітатара, як члена рэўкома ў апошняй карціне. Яго пачуццё да Марысі амаль нідзе больш не выказваецца. Скажам, у 5-й карціне Марыся атрымоўвае ад Міхася пісьмо, але гэта пісьмо па сваёй сухасці падобна больш на дакладную запіску. Тут ні аднаго слова аб пачуцці да Марысі няма, а між тым тут якраз ёсць месца для таго, каб гэтае пачуццё падкрэсліць яшчэ раз, інакш яно як-быццам выпароўваецца. На працягу апошніх трох карцін у Міхася ёсць толькі адна фраза, якую ён гаворыць да Марысі. Гэта значна абядняе яго ў сэнсе эмацыянальным.

З супроцьлеглага лагеру найбольшая роля адведзена Змітраку Закрэўскаму, праціўніку Міхася. Ен паказан, можа-быць, скупымі, але характэрнымі рысамі — гэта самазадаволены, фанабэрысты, упэўнены ў сабе чалавек. Упэўненасць гэта грунтуецца не на асабістых якасцях, а на яго кулацкім становішчы. Да жанчыны ён адносіцца, як да сваёй уласнасці. Ен лічыць, што мае права на каханне Марысі, бо плоціць за яго сваім багаццем. Адсюль і дакоры, і пагрозы, і грубыя вокрыкі.

Запамінаюцца яшчэ другарадныя вобразы, якія вялікага месца ў творы не займаюць, але абмаляваны яскравымі і характэрнымі рысамі. Такімі вобразамі з'яўляюцца салдат Пясоцкі, прапаршчык Агрызка, баба-лапатуха і інш.

Сюжэт лібрэта не вельмі складаны, але для лібрэта і гэтага замнога. Тут усё-такі ахапляюцца многія падзеі, якія адбываюцца ў розных месцах. Такая складанасць падзей не дае магчымасці поўнага раскрыцця асноўных вобразаў. Разам з тым ёсць шмат эпізадычных фігур, якія толькі загружаюць лібрэта і праходзяць, не пакідаючы следу. Часамі асноўная сюжэтная лінія паслабляецца, альбо зусім перарываецца, і дзеянне праходзіць па другой пабочнай лініі. З прычыны гэтага драматычная дзея ў асобных месцах не мае патрэбнага напружання.

Гэтыя недахопы ні ў якім разе не засланяюць сабою дадатных якасцей лібрэта. А гэтыя якасці вельмі значныя.

Асабліва добрае ўражанне пакідаюць тэксты песень як падабраныя з народнай творчасці, так і напісаныя самім аўтарам лібрэта. Яны заўсёды ўдала падкрэсліваюць і характар усяе дзеі, і псіхалагічны стан таго ці іншага героя.

Ёсць поўная ўпэўненасць у тым, што на аснове гэтага лібрэта будзе зроблена добрая опера. Упэўненасць гэта тым большая, што, наколькі я мог пазнаёміцца, музыка кампазітара Цікоцкага вельмі адпавядае народнаму характару песеннага матэрыялу і самых людзей, паказаных у гэтым творы.

„КАЦЯРЫНА ЖАРНАСЕК" М. КЛІМКОВІЧА

З даклада тав. І. Гурскага на пленуме Саюза савецкіх пісьменнікаў БССР

П'еса М. Клімковіча «Кацярына Жарнасек» напісана на гістарычную тэму. П'еса раскрывае старонкі далёкага мінулага нашага народа. Дзея адбываецца ў сярэдзіне XVI стагоддзя. Гэта быў час, калі пры каралю Жыгмонце-Аўгусце II узмацніўся прыток на Беларусь польскіх паноў, які закончыўся Люблінскай уніяй, калі беларускі народ трапіў у рукі польскіх магнатаў і шляхты. У гэты-ж час адбываўся перамер сялянскіх земляў памешчыкамі з мэтаю поўнага закабалення сялян, больш поўнага абкладання падаткамі і адрэзкі ад сялян лепшай зямлі.

У сярэдзіне XVI стагоддзя ўлада панскай Польшчы, падняволіўшы беларускі народ, спрабуе гвалтам яго апалячыць. Спрадвечная нянавісць да польскіх паноў і ксяндзоў узрастае з небывалай сілай. Адбываюцца сялянскія паўстанні. Свабодалюбівы беларускі народ вядзе гераічную барацьбу супроць сваіх прыгнятальнікаў — панскай Польшчы. Калі цярпець здзекі паноў становіцца не пад сілу, сяляне ўцякаюць на Украіну, да запарожцаў. Беларускі народ на працягу ўсёй сваёй гісторыі цягнуўся да Масквы, ненавідзеў панскую Польшчу і разам з вялікім рускім народам не адзін раз біў зарваўшыхся польскіх магнатаў і шляхту. Беларускі народ спакон вякоў змагаўся з кавaрнымі польскімі і літоўскімі панамі.

П'еса М. Клімковіча «Кацярына Жарнасек» раскрывае перад намі адну з старонак гераічнага мінулага нашага народа, яго барацьбу не на жыццё, а на смерць супроць ненавісных, крывежэрных польскіх магнатаў і шляхты.

Змест п'есы такі: Кацярына Жарнасек — дачка вызваленага ад прыгону селяніна, пакахала Рыгора Каваля, вольнага, які працуе па найму ў князя Івана Капусты, даяржаўцы каралеўскага замка, мясцовага беларускага магната. Іван Капуста ахвотна збліжаецца з Польшчай, пераймае польскія прыгонныя парадкі, польскія звычаі і ўтонченыя метады падняволення сялян. Народ, які ўвесь час цягнуўся да Масквы, сутыкаецца з Капустай і, завязаўшы сувязь з украінскімі казакамі, забівае яго, падымае паўстанне.

Другая лінія: князь Іван Капуста, даведаўшыся аб каханні Кацярыны і Рыгора, імкнецца ўзяць Кацярыну ў замак і запрыгоніць іх абодвух. Для гэтага Капуста скарыстоўвае папа, суддзю, войта ды іншых сваіх верных слуг.

Такі сюжэт п'есы. Ен узяты аўтарам з гістарычных дакументаў.

Не гледзячы на тое, што п'еса напісана аб далёкім мінулым нашага народа, аб барацьбе народных мас супроць сваіх заклятых ворагаў—польскіх паноў у XVI стагоддзі, яна з'яўляецца глыбока актуальнай і на сённяшні дзень. Цяпер, калі небяспека вайны пагражае як ніколі, калі панская Польшча збіраецца ў новы паход супроць вызваленага народа, — гістарычныя падзеі гераічнай барацьбы беларускага народа супроць польскіх магнатаў і шляхты, паказаныя ў мастацкіх вобразах, набываюць новае, выключна важнае значэнне. Загартаваўшыся ў барацьбе за сваё соцыяльнае і нацыянальнае вызваленне, беларускі народ, разам з іншымі народамі вялікага Савецкага Саюза, ўваб'е асінавы кол на магіле спрадвечных сваіх ворагаў—польскіх паноў.

У п'есе «Кацярына Жарнасек» аўтар паказаў цэлую галерэю цікавых мастацкіх вобразаў. Перад намі, з аднаго боку, абаяльны, хвалюючы вобраз маладой сялянскай дзяўчыны крышталёвай чысціні — Кацярыны Жарнасек, свабодалюбівы Рыгор, вобразы гаротніц паднявольнай працы—Прузыны і Агаты, вобраз згорбленай ад гора і пакут, узбуджаючай гнеў Марыны, задумлівы дзед Ахрэм, непакорныя Мікола Жарнасек і Івашка і цэлы рад іншых людзей, якія не хацелі гнуцца ў тры пагібелі перад панам. З другога боку—чорны, як ноч, блудлівы князь Іван Капуста, распусніца Ядвіся, марнатраўны шэльма, ганарлівы пан Юзеф Заенчкоўскі, прадажны суддзя пан Бобаецкі, поп Гаўрыла, іезуіт—ксёндз Антоній, прапіўшыйся шляхціц Дуля, ды шмат іншых прайдзісветаў.

Аўтар п'есы старанна працаваў над словам, гэтым асноўным сродкам, пры дапамозе якога ствараюцца характары. Драматург звяртаў вялікую ўвагу на індывідуалізацыю новых сваіх герояў, маючы на ўвазе выказванне А. М. Горкага, што «неабходна, каб гутарка кожнай асобы была строга своеасаблівай, да канца выразнай».

Дзеючыя асобы п'есы, як зазначае А. М. Горкі, ствараюцца выключна і толькі іх гутаркамі, г. зн. чыста размоўнай мовай. М. Клімковіч у сваёй п'есе дабіўся значных поспехаў у гэтым напрамку, асабліва па лініі стварэння адмоўных персанажаў. На маю думку, аўтару з адмоўных вобразаў больш за ўсё ўдаўся князь Капуста. Адразу, як толькі ў першай дзеі з'яўляецца князь Капуста, ён звяртае на сябе ўвагу, запамінаецца.

П'еса «Кацярына Жарнасек» М. Клімковіча з'яўляецца першым драматургічным творам, першай савецкай п'есай, якая паказвае гераічнае мінулае нашага народа, адважную барацьбу нашых продкаў супроць польскіх паноў.

У 1920 годзе банда Пілсудскага хацела аднавіць сярэднявечча, пасадзіць на шыю нашага народа магнатаў і шляхту. Беларускі народ, пры падтрымцы народаў вялікага Савецкага Саюза, пад кіраўніцтвам мудрай партыі Леніна—Сталіна раз і назаўсёды прагнаў белыя орды.

Ужо ў нашы дні ашалелыя сабакі — польскія і нямецкія фашысты праз тухачэўскіх, чарвяковых, галадзедаў, шаранговічаў і ім падобную дрэнь хацелі вярнуць ярмо беларускаму народу. Наша слаўная разведка на чале з сталінскім наркомам Н. І. Ежовым расціснула гэту гадзіну. Няхай ведаюць патомкі кайзера і Пілсудскага: больш не давядзецца ім таптаць нашы землі.

У п'есе «Кацярына Жарнасек» выкарыстан, і даволі ўдала, беларускі і украінскі фальклор.

Аўтар п'есы старанна працаваў над стварэннем станоўчых вобразаў. На маю думку, М. Клімковічу ўдалося стварыць яркі вобраз сялянскай дзяўчыны Кацярыны Жарнасек. У ёй сабраны благародныя рысы, уласцівыя працоўнай жанчыне. Яна разам з мужчынам гатова падзяліць гора і радасць, ісці ў адным радзе, плячо ў плячо, у барацьбе за сваё вызваленне.

Ствараючы вобраз Кацярыны, аўтар, выкарыстоўваючы багаты беларускі фальклор, надзяліў яе цёплай, хвалюючай лірычнай песняй. Але далей гэтага аўтар не пайшоў. Аўтару не ўдалося падняць гэты вобраз, зрабіць яго тыпам, сабраўшы характэрныя рысы працоўнай сялянкі, якая не толькі пратэставала супроць запрыгонення, але і дзейнічала. Апошняга нехапае ў п'есе. Аўтар, працуючы над сцэнічным варыянтам п'есы, павінен гэта ўлічыць.



Тав. М. КЛІМКОВІЧ.

Значна лепш напісан аўтарам вобраз Рыгора, які працуе па найму ў князя кавалём. У вобразе Рыгора аўтар паказвае лепшую частку сялянства, якая перш стыхійна, а потым разам з рабочым класам, пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі дасягнула перамогі.

М. Клімковічу ўдалося стварыць яркі трагедыйны вобраз Марыны. Гэта самая лепшая ўдача аўтара. Тут відаць вучоба драматурга ў геніяльнага майстра слова Шэкспіра.

Марына—старая мамка князя. Радасцю яе жыцця быў сын. Яго засеклі гайдукі пана. «Яна зненавідзела князя за сына, якога без часу глынула зямля». Марына паклялася адпомсціць князю. «За нашых дзяцей, за забітых бяз віны сваімі дзецьмі адказаць яны вінны». І Марына паслядоўна дабіваецца пастаўленай мэты. Яна выдае паўстанцам падзямельны ход, аддае ім ключы і разам з імі дзейнічае. Па сутнасці, галоўнай дзеючай асобай п'есы з'яўляецца Марына. Кожная яе рэпліка, дыялаг, маналог з любоўю напісаны аўтарам. Дарэчы, самым моцным у п'есе з'яўляецца другі акт, дзе прымае ўдзел Марына.

Князь Іван Капуста, які з'яўляецца прадстаўніком беларускіх магнатаў, нажыўшыся на рабаўніцтве, на чужых спінах, прадае інтарэсы народа, ахвотна збліжаючыся з панскай Польшчай. Гэта напамінае нам сучасныя падзеі, калі буржуазія дзеля сваіх асабістых інтарэсаў топча пад ногі ўсё—гэткая яе прырода. Гісторыя паказала, што нацыяналісты, г. зн. сучасныя фашысты былі, ёсць і будуць, пакуль не будуць знішчаны, самымі заклятымі ворагамі працоўных мас. Грошы, грошы і грошы—такі іх воўчы закон. За грошы бацьку і маці праладуць, любоў, дружбу, народ, дзяржаву.

Аўтару ўдалося стварыць цікавы вобраз свавольнай, гуллівай жанчыны Ядвісі, жонкі князя, а таксама вобраз ганарлівага пана Юзефа Заенчкоўскага—бацькі Ядвісі і цесця Капусты, шляхціца з каронная Польшчы.

Запамінаецца ксёндз Антоній, гэты хітры ліс, слуга бога і паноў, прадажны ад малгоў да касцей, іезуіт і цынік, верны спадарожнік капітала, натхніцель усялякіх авантур.

Галерэю падобных вобразаў, выведзеных аўтарам, можна было-б прадоўжыць. Да іх адносяцца Адам—старэйшы гайдук князя Капусты, поп Гаўрыла, прапіўшыйся шляхціц пан Дуля, суддзя Бобаецкі, якія аўтарам выпісаны і ўдала запамінаюцца пасля першай чыткі. Аўтар здолеў знайсці для кожнага з іх характэрныя рысы, якія ўласцівы іменна той ці іншай асобе.

З адмоўных персанажаў менш удаліся аўтару: Ясь—гайдук пані Ядвісі, пісар, Уладзік — гайдук пана Заенчкоўскага і інш.

Звяртае на сябе ўвагу вобраз старога селяніна—дзеда Ахрэма. Гэты традыцыйны вобраз у літаратуры набывае ў М. Клімковіча новую якасць. Праз гэты вобраз аўтар перадае думы і спадзяванні беларускага народа.

З станоўчых вобразаў добра акрэслены: Прузына—маці Кацярыны і Агата — маці Рыгора. Гэта звычайныя сялянкі, забітыя горам і няволяй, якія трапілі ў няласку да пана.

Нядрэнна акрэслен дзед Ксаверый. Што датычыць астатніх станоўчых вобразаў, як атаман Мікола Жарнасек, падатаман Івашка, стары казак Юхым і, асабліва, казакі, сяляне, дзяўчаты, дык яны, па-мойму, з'яўляюцца значна слабейшымі. Аўтару неабходна надаць ім больш характэрных чалавечых рысаў. Шмат іх зусім не дапамагаюць п'есе, а, наадварот, тармозяць развіццё дзеі лірычнымі адступленнямі, якія самі па сабе зроблены нядрэнна, але нічога агульнага не маюць з п'есай. Гэта, так сказаць, накладныя выдаткі, ад якіх зусім лёгка пазбавіцца.

П'еса М. Клімковіча «Кацярына Жарнасек», надрукаваная ў журнале «Полымя Рэволюцыі» №№ 11 і 12, з'яўляецца, хутчэй за ўсё, літаратурным творам, п'есай для чытання, а не для сцэны. Над сцэнічным варыянтам аўтару неабходна яшчэ папрацаваць, пазбегнуўшы перагружанасці п'есы гістарычнымі дэталямі, адступленнямі ад асноўнай сюжэтнай лініі, расцягнутасці, патрэбна і праца над мовай.

Не заўсёды напружана ў п'есе інтрыга. Аўтар, захапіўшыся лірычнымі адступленнямі, песнямі, дуэтам, хорам, трымае ў роўнавазе змагаючыяся лагеры. Адчуваецца некаторая рыхласць кампазіцыі, асабліва ў першым і трэцім акце. Самым моцным актам, з майго пункту гледжання, з'яўляецца другі акт.

На маю думку, аўтарам расцягнута экспазіцыя, адсюль некаторая вяласць першага акта. Аўтару не ўдалося спалучыць экспазіцыю з пачаткам самой драматычнай дзеі. Усё гэта таму, што аўтар, захапіўшыся песняй, пакінуў па-за ўвагай дынаміку п'есы. Першым момантам узбуджэння ў п'есе з'яўляецца рашэнне князя Капусты ўзяць у замак Кацярыну (IV з'ява). Рыгор, які з'яўляецца асноўнай дзеючай асобай, якая ў сілах супроцьстаяць пану, г. зн. узначаліць супраціўны бок, завязаць з панам барацьбу,—даведваецца пра гэта толькі к канцу акта (XIV з'ява). Гэта затрымлівае дзею п'есы, яе развіццё, дынаміку.

Найбольш удалы як з пункту погляду мастацкай апрацоўкі, так і па драматычнай напружанасці другі акт, асабліва там, дзе прымае ўдзел Марына.

Расцягнуты трэці акт. Яго можна значна скараціць за лік суда. Ад гэтага п'еса толькі выйграе.

У цэлым М. Клімковіч стварыў каштоўны мастацкі твор, які з'яўляецца не толькі дасягненнем для аўтара, але і для ўсёй беларускай савецкай літаратуры.

Пажадаем аўтару плённай работы на карысць нашага народа, на карысць вялікай партыі Леніна—Сталіна, якой аўтар прысвяціў свой першы твор.

Вялікі помнік рускай культуры

ПЕСНЯ АБ ПАХОДЗЕ ІГАРАВЫМ, ІГАРА, СЫНА СВЕТАСЛАУЛЕВА, УНУКА АЛЕГАВА

(Празаічны пераклад)

I.

Ці не лепей было-б, каб нам, брацця, пачаць старадаўнымі словы тужліву аповесць аб паходзе Ігаравым, Ігара Светаслаўліча?

Дый пачаціся песні той сягочасным ладам, а не складам Баянавым.

Баян бо чарадзейны, калі каму песню хацеў утварыці, то расцякаўся мысляй па дзераву, воўкам шэрым па полі, арлом сівым пад воблакі.

Помнячы бо, скажам, даўных часаў разруху, выпушчаў дзесяць сокалаў на лебедзяў стада, а якую з іх дагоніваў сокал, тая першая песню пяяла старому Яраславу ці харобраму Імсціславу, што зарэзаў Радзедзю перад войскам касожынскім, або краснаму Раману Светаслаўлічу.

Але, брацця, Баян-жа не сокалаў дзесяць пускаў на лебяджае стада, — ён свае чарадзіўныя пальцы на струны жывыя ўскладываў, а тыя князям самі славу галасілі.

Дык пачнем-жа гэтую, брацця, аповесць ад старага Уладзіміра да Ігара сягочаснага, што сказаў розум сілай сваёй і навайстрыў сваёй мужнасцю сэрца; напоўніўся духу барацьбянага і павёў свае войска адважнае на землі Палавецкія, за Рускія землі.

II.

Тады азірнуўся на светлае сонца Ігар і бачыць пакрытымі цемрай ад сонца ўсіх сваіх вояў. І скажа Ігар тут дружыне сваёй:

— «О, брацця й дружына лепей-жа быці пацятаму, чым быці ў палоне: пасядзем-жа, брацця, на быстрыя коні свае зірнуці на Дон сінявокі».

На вум князю ўспала жаданне, не глездзячы з неба варожбаў, паспытваць Дону вялікага.

— «Хачу бо, — кажа, — дзіду заламаці аб поля канец палавецкага; з вамі, русіны, хачу сваю голаў злажыці, або напіціся шоламам з Дону»!

О, Баяне, часінаў старых, салавейча! Апеяў-бы ты гэты паход, імкнучы салоўкай па дрэву выдумнаму, духам сягаючы воблакаў, славай звіваючы гэтага часу абедзьве паловы. Траянавы сочачы след, цераз поле на горы! Песню спяваў-бы тады для Ігара, унука таго:

«Не сокалаў бура занесла праз поле
шырокае,
Галіцаў стады каціліся к Дону
вялікаму»...

Або апяяці было, чарадзейны Баян, Велеса ўнуча:

«Коні іржуць за Сулаю,
Слава звініць у Кіеве,
Трубы трубяць у Ноўгарадзе»...

Сцягі стаяць у Пуціўлі, жджэ Ігар мілага брата Усевалода.

І скажа яму буй-тур Усевалад:

— «Адзін брат, адзін свет светлы — ты, мой Ігару! Абодвы з табой Светаслаўлевы дзеці. Сядлай, браце, быстрыя коні свае, а мае для цябе на гатове ўжо аседланы ўперад ля Курску. А куршчане мае табе ведамы кметы: пад гудамі трубаў радзіліся, пад шоламамі ўзгадаваліся, канцом дзіды ўскормлены: ім шляхі вядомы, ім рыцьвы знаёмы, лукі ў іх нацягнуты, сто стрэл нарыхтавана, шаблі навостраны, самі яны мчаццa, як шэрыя ваўкі па полі, шукаючы чэсці сабе, а князю славы».

Тады князь Ігар уступіў у залатыя страмёны і паехаў па чыстаму полю. Сонца яму цемнатой заступіла дарогу; ноч, стогнучы грозьбы яму, разбудзіла птушко, а выццё звярынае ў стады іх збіла; Дзіў кліча паверх лесу, слухаць наказвае зямлі незнаёмай — Волзе, і Памор'ю і Пасулью, і Суражу, і Карсуню, і табе, тмутараканскі балване!

А полаўцы нецярэбленымі шляхамі к Дону пабеглі вялікаму: толькі калёсы скрыпяць іх апоўначы, маўляў, тыя лебедзі спуджаны.

Ігар к Дону войска вядзе.

А ўжо бяда яго пасець птаха па дзераву, ваўкі па ярах нядобрае варожуць; арлы клёкатам звяр'ё завуць косці збіраць; лісіцы брэшуць на шчыты бліскучыя.

О, зямля Руская! Ты ўжо за рубеж перасягнула!

Доўга ноч танула ў мроку; зараніца досвіт набліжала; імгла поле засланіла; заснуў свергат салавейчы; гоман галічы ўзбудзіўся.

Русіны поле шырокае загарадзілі шчытамі бліскучымі, шукаючы чэсці сабе, а князю славы.

III.

З пазаранку ў пятніцу, патаптаўшы паганае войска палавецкае і рассыпаўшыся стрэламі па полю, паімчалі прыгожых дзяўчат палавецкіх, а з імі золата і папоны, і аксаміты дарагія; плашчамі, апоньчамі і кажухамі ды ўсялякімі палавецкімі тканінамі ўзорнымі пачалі масты масціць па балотах і гразкіх месцах.

Сцяг чырвоны, харугвя белая, чырвоны бунчук, сярэбраная дзіда — Светаслаўлічу Храбраму!

Дрэмле ў полі Алегава гняздо Харобрае. Далёка заляцела! Не было яно зроджана ў крыўду ні сокалу, ні крэчату, ні табе, чорны груган, паганы палаўчаніне!

Гза бяжыць шэрым воўкам, Канчак яму знача след к Дону вялікаму.

На другі дзень вельмі рана крывавыя зоры свет узнімаюць, чорныя хмары з мора ідуць, хочуць прыкрыці два сонцы, а ў хмарах маланкі мігаюцца сінія.

Быці вялікаму грому. Ісці дажджу стрэламі з Дону вялікага! Тут пала мацціся дзідам, тут пашчарбаціцца шаблям аб шоламы палавецкія на рэчцы Каяле, ля Дону вялікага.

О, Руская зямля! Ты ўжо за рубеж перасягнула.

Вось, ветры, Стрыбожыя ўнукі, павеялі стрэламі з мора на храбрае войска Ігарава. Дудніць зямля; рэкі мутна цякуць, порась поле пакрывае; сцягі гамоняць.

Ідуць полаўцы ад Дону і ад мора, і ад усіх старон рускае войска абступілі. Дзеці нячысцікавы клікам поле перагарадзілі, а русіны храбрыя загарадзілі яго шчытамі чырвонымі.

Яр-тур Усеваладзе! Стаіш у барацьбе й засыпаеш ты вояў варожых стрэламі, грыміш ты аб шоламы мечамі сталёвымі. Дзе толькі даскочыш сваім залатым, тур, свецячы шоламам, ляжаць там паганыя галовы палавецкія. Пашчапаны гартоўнымі шаблямі й шоламы аварскія — ад цябе, яр-тур Усеваладзе!

Якая пана ранам, брацця, таму, хто забыўся пачоту й жыцця, і Чарнігава горада, забыўся на бацькаўскі стол-пасад залаты, на сваю мілую пяшчоту, ясную Глебаўну, на звычай і абычай!

IV.

Былі векі Траянавы, прамінуліся леты Яраслаўля. Былі паходы Алегавы, Алега Светаслаўліча: той-бо Алег мечам разруху каваў і стрэлы сеяў па зямлі. Ступае за звонам у стрямя залачонае ў горадзе Тмутаракані: той звон даўны чуе вялікі Яраслаўлін сын — Усевалад, а Уладзімір кожну раніцу затыкаў вушы ў Чарнігаве. Барыса-ж Вячаслаўліча нядобрая слава на суд прывяла на апошні, і ў зялёным запінні каялным божую пасцель паслане за крыўду Алегаву, маладога і храбрага князя. З таей-жа Каял ракі Яраполк палялеяў між Угорскімі іначолaмі бацьку свайго да Софіі святое да Кіева.

Тады пры Алегу Гарыслаўлічу рассяваліся й раслі міжусобіцы. Гібнула жыццё Дажбожага ўнука: у калатнінах князевых людзі свой век скарачалі.

Тады на рускай зямлі радка пяяў аратай; але варанне пакрумквала часта, дзелячы труп'ё між сабою, а галіцы гоман заводзілі свой, на ежу ляцецi збіраючыся.

Было гэта ў бітвы і ў тыя паходы, а гэтакіх бітваў і слухам не чулі.

V.

Ад рання да вечара, ад вечара да світу лятуць стрэлы гартоўныя, грымяць шаблі аб шоламы, трашчаць дзіды сталёвыя ў полі незнаёмым, сярод зямлі Палавецкае. Чорная зямля пад капытамі касцьмі была пасеяна, а крывёй палітая, — туга абышла па Рускай зямлі.

Што там шуміць? Што там звініць далёка рана перад зарою?

— Ігар палкі заварачвае: жаль-бо яму міла брата Усевалада.

Біліся дзень, біліся другі, трэцяга дня к палудню рухнулі сцягі Ігаравы. Тут два браты разлучыліся на беразе быстрай Каялы. Тут віна крывавага нехапіла, тут баль дакончылі храбрыя русіны: сватоў напаілі, а самі палеглі за Рускую зямлю.

Нікне трава ад жаласці, а дзерава пад тугою к зямлі прыхілілася.

VI.

Ужо вось, брацця, невясёлая гадзіна наступіла, ужо пустыня сілу прыкрыла.

Крыўда паўстала ў сілах Дажбожага ўнука, дзевай узыйшла на зямлю Траянаву, усплеснула крыллем лебяджым на сінім моры, а плюскаючы ў Доне, спудзіла часіны шчаслівыя.

Князевы міжусобіцы — згуба для нас ад паганых. Казаць стаў брат брату: «Гэта маё і тое-ж маё!». І пачалі князі аб малым — «гэта вялікае» казаці і самі на сябе загубства кавалі. А паганцы з усіх старон набягалі з перамогай на Рускую зямлю.

О! далёка сокал заляцеў, птушак збіваючы, к мору!

А Ігараву храбраму войску не ўваскроснуці. Па ім загаласіла Карына, і Жаля панеслася па Рускай зямлі, народзячы смагу людзям у полымі рогу. Заплакалі жонкі рускія, галосячы:

— «Ужо нам сваіх мужоў мілых ні мысляй памысліць, ні думай падумаць, ні вачмі сваімі азіраці, а золата й срэбра таго й пагатове не бачыць ніколі».

І застагнаў-жа, брацця, Кіеў тугою, а Чарнігаў напасцямі! Нуда разлілася па Рускай зямлі; няўцешная жальба пацякла сярод Рускай зямлі. А князі сабе самі праступства кавалі; а паганыя самі адны, з перамогамі навалiўшыся на Рускую зямлю, дань вымагалі па белцы з двара.

Тыя-бо два храбрыя Светаслаўлічы, Ігар і Усевалад, ужо напраўду збудзілі, якую тут прыспаў быў іх бацька. Светаслаў грозны, вялікі, кіеўскі. Быў ён гразою; верх браў сваім войскам магутным і мечамі сталёвымі. Наступіўшы на зямлю Палавецкую, патаптаў узгоры і долы; замуціў і вазёры і рэкі; засушыў балоты й крыніцы. А паганага Кабяку з узлучыны морскай, ад жалезных вялікіх палкоў палавецкіх, як віхрышча выхапіў... І зваліўся Кабяк у горадзе Кіеве, у замку Светаслаўлевым.

Тут немцы і венецыйцы, тут грэкі і маравы пяюць славу Светаслаўлю, выдумляюць на князя Ігара, што патапіў багацце на донні Каялы — ракі Палавецкай, насыпаўшы рускага золата там. Там Ігар князь зсядаў з залатога сядла і садзіўся ў сядло нявольніка.

Занылі сцены гарадоў, завяла весёласць.

VII.

А Светаслаў сумны сон сніў у Кіеве на гарах у гэтую ноч.

— «З вечара адзявалі мяне, кажа, у чорную пасцілку на цісовай краваці; чарпалі мне сіняе віно, змешанае з зеллем; сыпалі мне з пустых калчанаў паганых полаўцаў буйныя пэрлы на грудзі, ды песцяць мяне. Ужо дошкі без скрэпаў на маіх залатаверхіх харомах. Усю ноч з вечара дзікае груганнё грэкала; пабыло каля Плесеньску на балоні, каля нетраў Кісані, і к сіняму мору няслося».

І сказалі баяры князю:

— «Ужо, княжа, туга розум твой замуціла: гэта вось два сокалы зляцелі з бацькава залатога пасаду, каб горад Тмутаракань пашукаці, або напіціся шоламам Дону. І ўжо сокалам крыллі падсечаны шаблямі погані, а саміх іх павуцінай жалезнай апуталі. Цёмна было ўжо на трэці дзень: два сонцы патухлі, абодвы чырвоныя згаслі слупы, а з імі і месяцы два маладыя. Алег і Светаслаў заваліклiся цямрыцай і ў моры яны патанулі, і гордасці хану дадалі вялікай. На рэчцы на Каяле святло цьма пакрыла; па Рускай зямлі, як рысяў племя, распасцерліся полаўцы Ужо ўзнялася над хвалай пахула, ужо ўзсела насілле над воляй і ўжо ўрэзаўся Дзіў на зямлю. Вось-бо гоцкія красныя дзевы запелі на беразе сіняга мора, золатам звонячы рускім: пяюць яны Бусавы часы, і помсту лялеюць Шараканаву... А мы ўжо, дружына твая, не знаем вясёласці».

Тады вялікі Светаслаў абазваўся слаўцом залатым, са слязамі змешаным, і сказаў:

— «О, мае сыноўцы, Ігару і Усеваладзе! Рана пачалі вы зямлю Палавецкую рэзаць мечамі, а славы шукаці сабе. Але не з чэсцяю ўходалі, бо не з чэсцей паганскую кроў пралілі. Вашы адважныя сэрцы ў сталі нязломнай закованы і згартованы адвагай. Дый што вы стварылі маёй сярэбранай сівізне! Не дажадаліся вы сільнага й багатага брата майго Яраслава з яго многавоямі, з чарнігаўскімі ваякамі — з магутамі і з татранамі, і з шальбірамі, і з тапчакамі, і з рэвутамі, і з ольберамі. Яны-ж, бывала, без шчытоў, з захаляўнымі нажамі клікам палкі пабяджаюць, звонячы прадзеднян славай. Але вы сказалі:

— Храбрымося самі! Самі пярэднюю славу захопім і з заднюю самі падзелімся».

— «А ці-ж дзіва тут, брацця, і стараму памаладзеці? Калі сокал у гадах, высока ўзбівае ён птушак, свайго не папусціць у крыўды гнязда! Але ў тым гора, што князі ўжо мне ў не падмогу. У нішто абярнуліся тыя часіны! Вось у Рымаве крычаць пад шаблямі палавецкімі, а Уладзімір пад ранамі. Туга і нудота Глебаву сыну!»

VIII.

Княжа вялікі, Усеваладзе! Ці не мысляй табе-б прыляцеці, каб бацькаў пасад уберагчы! Ты-бо можаш расплёскаці вёсламі Волгу, а шоламам вычарпаць Дон. Каб ты быў, то была-б па ногаце*) нявольніца, а па рэзане**) нявольнік. Ты бо можаш насуха жывымі страляць самастрэламі — удалымі Глеба сынамі.

*) і **) Ногат і рэзан— тагочасныя грошы.

Ты буй — Рурыча й Давідзе! Ці-ж не вашыя гэта ў крыві палачоныя шоламы плавалі? Ці-ж не ваша дружына адважная рыкае, як туры, гартоўнымі ранена шаблямі ў полі незнаёмым? Уступіце, сябры, у залатыя страмёны за крыўду гэтага часу, за Рускую зямлю, за раны Ігаравы, смелага Светаслаўліча!

Галіцкі Асмамысле Яраслаўле! Высока сядзіш ты на пасадзе сваім златкаваным; падпёр Угорскія горы сваімі палкамі жалезнымі, шлях заступіў каралю, зачыніў Дунаю вароты, шыбаючы бярэмі цераз воблакі, да Дунаю суды судзячы. Грозьбы твае па землях цякуць; адчыняеш Кіеву вароты; страляеш з бацькавага пасаду залатога султанаў па-за землямі... Страляй, княжа, Канчака паганага раба, за Рускую зямлю, за раны Ігаравы, адважнага Светаслаўліча!

А ты, буй-Рамане і Мсціслаўле! Храбрая мысль носіць розум ваш на дзела. Высока плывіцё на дзела, з адвагай, як сокал на ветрах лунаючы, хочучы сходаці птаха ў бітве. Есць-бо ў вас жалезныя наперснікі пад шоламамі лацінскімі. Ад іх затрэсліся ўжо землі і шмат якіх краёў: Хінова, Літва, Дарамела, Ятвягі. Полаўцы, кінуўшы дзіды свае й галовы свае накланіўшы пад тыя стальныя мечы.

Але ўжо, княжа Ігару, аслабела сонца святло, а дзерава лісць не на добрае скінула: Па Росі і Суле гарады падзялілі, а Ігарава храбрага войска не ўваскрасіці. Дон, цябе, княжа, кліча і іншых князёў заве на пабеду.

Альговічы, храбрыя князі, угаміліся ў барацьбе. Інгвар і Усевалад і ўсе тры Імсціслаўлічы — не благога гнязда птахі шасцікрылыя! Не жэрабем пабедным сабе ўладу прыдбалі! Што-ж вашы шоламы залатыя і ляшкія шчыты?.. Загарадзіце полю вароты сваймі вострымі стрэламі за зямлю Рускую, за раны Ігаравы, буйнага Светаслаўліча!

IX.

Ужо-бо Сула не цячэ ручаямі срабрыстымі к гораду Пераяслаўлю, ужо Дзвіна балотам цячэ к тым грозным палачанам, пад воклік паганых. Адзін толькі Ізяслаў, сын Васількавы, пазвінеў сваімі вострымі мечамі аб шоламы Літоўскія. Перабіў славу дзеду свайму Усеславу, а сам пад чырвонымі шчытамі на крывавай траве, пабіты літоўскімі мечамі, а Хоціем лёг, а той кажа:

— «Дружыну тваю, княжа, птахі крыллем апранулі, а звяры кроў палізалі!»

Не было тут брата, Брачыслава, ні другога, Усевалада; адзін ён выпусціў жамчужную душу з храбрага цела цераз залатое ажарэлле.

Занылі песні, зачахла вясёласць, трубяць трубы Гарадзенскія.

Яраслаўле і ўсе ўнукі Усеслаўлевы! Апусціце ўжо сцягі свае! Пахавайце мечы свае пашчарбаныя! Вы-бо сваімі нязгодамі пачалі наводзіць паганых на Рускую зямлю, на надзел Усеслава, ад чаго і насілле пайшло ад зямлі Палавецкай.

У сёмы Траянавы век жарабля кінуў Усеслаў аб дзяўчыне мілай сабе. Падпёршыся клюкамі, ён на кані паімчаўся да горада Кіева і дацягнуўся дзідаю да Кіеўскага залатога пасаду. Ад іх скочыў зверам дзікім. Апоўначы з Белгарада ахутаўся сіняй імглой, а на раніцу, узняўшыся, браму стракалам адчыніў Ноўгараду, разбіў Яраслаўлеву славу і скочыў ваўком да Нямігі з Дудутак.

На Нямізе снапы сцелюць галовамі, малоцяць цапамі сталёвымі, жыццё кладуць на таку, душу веюць ад цела. Нямігі крывавыя берагі не дабром былі засеяны, — засеяны былі касцьмі сыноў рускіх.

Усеслаў князь людзям суд судзіў, гарадамі князёў надзяляў, а сам поначы воўкам гуляў. З Кіева да пятухоў дасцігаў Тмутаракані; вялікаму Хорсу ваўком шлях перабягаў. Таму ў Полацку рана звоны пазванілі к заўтрані ў Софіі Святой, а ён у Кіеве звон чуе. Хоць і вешчая душа ў дзёрскім целе была, але часта бяды нацярпеўся. Яму першаму вешчы Баян і прыпеўку злажыў дасціпную.

«Ні хітраму, ні быстраму,
Ні шпаркаму птаху
Не мінуці божага суду».

О! Стагнаці Рускай зямлі, успомніўшы быўшу часіну і быўшых князёў!

Старога таго Уладзіміра немагчыма было прыкаваці да Кіеўскіх гораў! Цяпер-бо яго сцягі сталі — адны Рурыкавы, а другія — Давідавы, але хобаты іх паасобку калышуцца.

X.

Пяюць дзіды на Дунаю. Яраслаўны голас чуецца. Беспрыпыннаю зязюляй раным-рана галосіць:

«Паляту, кажа так, па Дунаю зязюляй, абмачу рукаво бабровае ў Каяле-рацэ, абатру князю раны яго на магутным на целе яго».

Яраслаўна зрання плача ў Пуціўлі на сцяне, наракаючы:

«О, вецер, вятрыска! Чаму ты насільна так вееш? Чаму імчыш ханскія стрэлы на лёгенькім крыллі сваім ды на вояў мужа майго? Ці-ж веяці мала табе ўгары пад аблокі, лялеючы ў моры сінім караблі? Чаму ты вясёласць маю па кавыллі развеяў»?

Яраслаўна зрання плача ў Пуціўлі горадзе на сцяне, наракаючы:

«О, Днепру Славуцічу! Горы каменныя ты перасек скрозь землі Палавецкія; чоўны лялеяў ты на сябе Светаслаўлевы к войску Кабякаву. Прылялей-жа й мужа майго да мяне, каб рана я слёз не ссылала на мора к яму»!

Яраслаўна зрання плача ў Пуціўлі на сцяне, наракаючы:

«О, светлае сонца, прасветлае! Усім ты нясеш і цяпло і красу. Нашто-ж нанясло ты свой промень гарачы на вояў тых мужа майго? На полі бязводным ім смагаю лукі звяло, а ўтулы тугой ім заткала»!

XI.

Прыснула мора з поўначы, смерчы імгламі ідуць. Князю Ігару бог знача дарогу з зямлі Палавецкай на Рускую зямлю, дзе бацькаў пасад яго жджэ.

Патухла вячэрняя зорка.

Ігар спіць, Ігар вока не зводзіць, Ігар думкаю мерае поле ад Дону вялікага к малому Данцу.

Апоўначы свіснуў Аўлур за ракою каню, разумеці загадвае князю.

А князя Ігара няма!

Клікнуў — дрыгнула зямля, зашумела трава, палавецкія вежы ўспужаліся.

А князь Ігар к трыснягу гарнастаем панёсся і гогалем белым памчаўся к вадзе. На быстрага рынуў каня, саскочыў з яго босым воўкам, к логу Данца пакаціўся й паляцеў сокалам пад імгламі, забіваючы гусі і лебедзі к снеданню, полудню й вячэры.

Як Ігар паляцеў сокалам, тады воўкам Аўлур пакаціўся, абіваючы росы сабою сцюдзёныя: падарвалі бо коней сваіх быстраногіх.

І кажа рака-Данец:

— «Княжа Ігару! Не мала вялічча табе, Канчаку дакуці, а радасці Рускай зямлі!»

А князь Ігар кажа:

— «О, Доньча! Не мала вялічча табе, што лялееў ты князя на хвалях і зялёную траву яму падсцілаў на сваіх берагах срэбраных, адзяваючы цёплымі імгламі яго пад ценем зялёнага дзерава, і сцярог на вадзе яго гогалем, чайкамі на ручаях, чарнедзямі на ветрах... Не такая—кажа—рака Стугна. Маючы вузкі працёк, праглынуўшы чужыя ручаі й распасцёршы хвалі к утоку, князю Расціславу маладому берагам цёмным Дняпро зачыніла. Плачацца маці Расціслаўля па сваім маладым князю Расціслаўлю. Кветкі жальбою занылі, а дрэва з тугою к зямлі нахілілася».

Не сарокі так застракаталі: гэта едзе Ігаравым следам Гза з Канчаком. І тады груганы не закрумкалі, галкі замоўклі, сарокі не стракаталі,—па лозах паўзалі толькі. А дзятлы тукатам к рэчцы шлях паказваюць, салавейкі вясёлымі песнямі раніцу згадваюць.

І гаворыць Гза Канчаку:

— «Калі сокал ляціць да гнязда мы застрэлім сакаліча стрэлмі сваймі залатымі!»

А Канчак Гзе адказвае:

— «Калі сокал ляціць да гнязда, — мы сакольца апутаем краснаю дзевай!»

А Гза кажа Канчаку:

— «Калі мы яго дзеваю краснай апутаем, мець не будзем мы ні сакаліча, ні краснае дзевы, ды пачнуць нас тады біці птахі ў полі Палавецкім!».

XII.

І сказаў Баян аб днях Светаслаўлевых, Баян-песнятворац далёкага часу, Яраслаўлева, Алегава:

— «Княжа! Хоць і цяжка табе, галаве, без плячэй, але трудна табе, целу, без галавы!»

Так і рускай зямлі без Ігара. Сонца свеціцца на небе. Ігар князь—на Рускай зямлі. Пяюць дзевы на Дунаю, галасы плывуць праз мора і да Кіева. Ігар едзе па Барычаву да святое багародзіцы Пірагошчай. Рады староны, веселы гарады.

Спяяўшы песню старым князям, а пасля маладым пяяці:

«Слава Ігару Святаслаўлічу, буй-туру Усеваладу, Уладзіміру Ігаравічу! Здароўя князям і дружыне, выступаючым за хрысціян на войска паганых! Слава князям і дружыне!»

Пераклаў **ЯНКА КУПАЛА.**



Ілюстрацыя да «Слова аб палку Ігаравым» работы мастака Гіалеха—Івана Голікава.

„Слова аб палку Ігараву“

у паэтычным перакладзе Янкі Купалы

Паэтычная сіла Янкі Купалы моцна звязана з магутнай крыніцай паэтычнага натхнення — народнай паэзіяй, і таму не мог ён не звярнуць увагі на такі помнік рускай літаратуры, як «Слова аб палку Ігараву», які прасякнут найвялікшай сілай народнай творчасці, невычарпальным запасам вобразаў, вечна жывучай свежасцю.

Янка Купала ў сваёй рабоце над мастацкім пераладжэннем «Слова» не пайшоў за перакладчыкамі, якія захапляліся «сівой старынай» помніка і для якіх падзеі, паказаныя ў ім, былі толькі повадам для паэтычных кампазіцый на гэту тэму.

У перакладзе Купалы захавана сіла думак, пачуццяў, эмацыянальнай напружанасці ўзору-арыгіналу. У рабоце над перакладам Купала выкарыстаў лепшыя дасягненні вершаскладання беларускай літаратуры і, у прыватнасці, эмацыянальную напружанасць свайго ўласнага верша.

У радзе месц Купалу не толькі ўдаецца захаваць сэнс, дух і вобразнасць «Слова», — ён знаходзіць і рытм, адэкватны размеранай прозе «Слова», які перадае і атмасферу арыгіналу.

С зараніа до вечера,
с вечера до света
летять стрелы каленыя,
гримлють сабли о шеломы.

У Купалы гэтыя радкі перададзены з гранічнай блізкасцю да думкі і духу арыгіналу:

Ад раніцы да вечара,
Ад вечара да раніцы
Лятуць стрэлы гартоўныя,
Грымяць мечы аб шоламы.

Упарта і паслядоўна Купала імкнецца ў сваім вершаваным перакладзе данесці больш поўна лірычную і эмацыянальную сілу «Слова».

Гэта імкненне асабліва ярка ўвасоблена паэтам у перакладзе плачу Яраслаўны.

«Ці-ж веяці мала
Табе пад аблокі
У гары, ў паднябессі
Шырокім, далёкім?»,
«Або ў сінім моры
Лялеяць, гайдаці
Чаўны з караблямі
Да ціхае гаці?»
«Чаму ты, ўладару,
Мне радасць асіліў,
Вясёласць развеяў
Па дзікім кавылі».

Асаблівасць купалаўскага пералажэння надзвычай ярка выражана ў паказе ўцёкаў Ігара.

У Купалы гэта месца, аб якім Пушкін адзываўся, як аб адным з лепшых месц песні, перададзена таксама дынамічна, маляўніча і ярка.

А князь Ігар ужо гарнастаем
Паскакаў па траве к трыснягу,
На вадзе выплыў гогалем белым,
На каня узваліўся ў бягу.
І саскочыў з яго босым воўкам,
Пакаціўся да логу Данца,
І паляцеў сокалам пад імгламі,
Забіваючы там без канца
На сняданне, абед и вячару
Белых лебедзяў, шэрых гусей.

Купала не проста капіруе паэтычныя вобразы «Слова», але сваімі сродкамі — паэтычнай мовай сучаснасці ён перадае іх з гранічнай блізкасцю.

Погасоша вечеру зори.
Игорь спить, Игорь бдить,
Игорь мыслію поля мерить
от великого Дону до малого Донца.

У Купалы:

Патухла вячэрняя зорка.
Князь Ігар і спіць і не спіць.
Ад Дона вялікага думкай
Да Донца малога бяжыць.

Перакладаючы стараpускае «Слова» вершаванай мовай сучаснасці, Я. Купала ўносіць у паэтычную творчасць яшчэ і тлумачальны элемент.

У «Слове» ёсць такое месца, дзе аўтар звяртаецца да Тмутараканскага істукана:

...Велит послушати...
и тебе, Тьмутороканьскый блъван.

Купала больш ясна перадае гэтае месца, як-бы ўнутрана расшыфроўвае яго:

Кажа і табе слухаць, балване,
Што разбаярыўся ў Тмутаракане.

Паэт-перакладчык яўна растлумачвае, што «Тьмутороканьскый блъван» гэта статуя, якая ўпрыгожыла Тмутаракан.

У «Слове» расказана аб тым, што «Бориса же Вячеславлича слава на суд приведе».

Звычайна ў старой Русі слова «суд» ужывалі ў сэнсе «смерць». Купала, нічога не змяняючы ў сказе, дадае слова «апошні» і ў кантэксце «апошні суд» становіцца гранічна яснай думка аўтара.

Ва ўсёй тлумачальнай рабоце Купала не мадэрнізіруе, а захоўвае дух твора.

Складанейшыя задачы паэтычнага пераладжэння гэтага старажытнага помніка прыводзяць аўтара перакладу і да раду недакладнасцей, а часам і проста да няправільнага тлумачэння некаторых асобных месц.

Незразумела, чаму Я. Купала тэкст «Слова»:

Чръныя тучя с моря идуть,
хотять прикрыти 4 солнца, —
а в них трепещуть синіи млъніи... —

перакладае:

Сонцы два прыкрыці хочуць,
Як нясныя заранкі.
А у хмарах гэтых чорных
Ззяюць сінія маланкі.

Чатыры сонцы—гэта чатыры рускіх князі, якія пайшлі на полаўцаў—Ігар, яго брат Усевалад Курскі, сын Уладзімір і пляменнік Святаслаў.

Імкненне быць бліжэй да арыгіналу часам звязвае верш Купалы; ствараюцца сінтаксічна непараканальныя групіроўкі, якія ў некаторых месцах парушаюць прыгажосць і гучнасць верша перакладу. Але яны хутчэй датычаць тлумачальнага элементу, чым паэтычнага, і ні ў якім выпадку не засланяюць велізарнай мастацкай якасці перакладу, маляўнічай сілы купалаўскага верша, якасці якога павінны быць шырока і дэталёва вывучаны.

В. А. Жукоўскі ў 1809 годзе, устанаўляючы законы перакладу, пісаў, што перакладчык у прозе раб, перакладчык у вершах — сапернік арыгіналу. Купала не сапернічаў з арыгіналам, ён высока ацаніў мастацкія якасці «Слова» і зрабіў усё для таго, каб глыбокая ідэя і паэтычная сіла «Слова» ў перакладзе таксама зачароўвала нашага чытача, як яна зачароўвала сучаснікаў аўтара.

І. ДОРСКІ.

НАРАДА АКТЫВА РАБОТНІКАЎ МАСТАЦТВАЎ БССР

26—27 мая адбылася нарада актыва работнікаў мастацтваў БССР, скліканая Упраўленнем па справах мастацтваў БССР.

Нарада абмяркавала пытанні аб падрыхтоўцы да дэкады беларускага мастацтва ў Маскве, правесці якую намечана ў красавіку 1939 года, і аб удзеле работнікаў мастацтваў у кампаніі па выбарах у Вярхоўны Совет БССР.

З дакладам аб рашэнні Бюро ЦК КП(б)Б і СНК БССР аб падрыхтоўцы да дэкады беларускага мастацтва ў Маскве выступіў начальнік Упраўлення па справах мастацтваў тав. **Патапейка.** Дакладчык указаў, што ЦК КП(б)Б і СНК БССР абавязваюць работнікаў мастацтва зараз-жа прыступіць да падрыхтоўкі дэкады беларускага мастацтва ў Маскве. Створана ўрадавая камісія якая ўзначальвае ўсю падрыхтоўчую работу. Упраўленню па справах мастацтваў, праўленню Саюза совецкіх пісьменнікаў і праўленню Саюза совецкіх кампазітараў даручана арганізаваць работу па стварэнню новых твораў, якія-б паказвалі гераічнае мінулае і гераічнае сучаснае беларускага народа.

Вялікую ўвагу трэба аддаць падрыхтоўцы да дэкады Тэатра оперы і балета БССР. Наш оперны тэатр на дэкадзе павінен будзе паказаць арыгінальныя беларускія оперы «Міхась Падгорны», «Дрыгва», балет «Салавей», над якімі тэатр працуе. Зараз пастаўлена задача стварэння яшчэ адной оперы «Пагранічнікі», якая-б адлюстравала шчаслівае жыццё беларускага народа і непрыступнасць свяшчэнных совецкіх граніц.

Вялікія абавязкі ўскладаюцца і на Дзяржаўную Філармонію БССР. Яна павінна падрыхтаваць песні і музыкальныя творы, якія-б адлюстравалі шчаслівае жыццё народаў Совецкай Беларусі. Яна павінна паказаць росквіт народнага мастацтва БССР—народныя песні і народныя танцы. Шырока на дэкадзе павінна быць паказана і мастацкая самадзейнасць беларускага народа. Для гэтага патрэбна правесці шырокі агляд рабочай, калгаснай і дзіцячай самадзейнасці, каб лепшыя ўзоры яе паказаць у Маскве.

Пасля даклада разгарнуліся ажыўленыя спрэчкі. Выступаўшыя адзначылі, што даклад тав. Патапейкі быў павярхоўным, зусім несамакрытычным і не задаволіў удзельнікаў нарады. Дакладчык не паказаў сапраўднага становішча на фронце мастацтва БССР, абмежаваўся толькі пералікам некаторых прозвішчаў работнікаў мастацтва, не ўскрыў недахопаў і перашкод на шляху развіцця мастацтва.

Першым выступіў кампазітар праф. **Залатароў.** Ён гаварыў аб тым, што дагэтуль не можа здзейсніць свайго жадання напісаць оперу з-за адсутнасці... лібрэта. Упраўленне не цікавіцца гэтым.

Зараз стаіць пытанне аб стварэнні новай оперы «Пагранічнікі». Праф. Залатароў выказаў жаданне працаваць над гэтай операй і заявіў:

— Я лічу гонарам пісаць для нашага совецкага гледача і аддам усе свае сілы гэтай рабоце.

— Тое, што БССР дагэтуль не здолела паказаць свайго мастацтва ў Маскве, з'яўляецца вынікам подлага шкодніцтва ворагаў народа на фронце нашага мастацтва, — гаворыць мастацкі кіраўнік Беларускага драматычнага тэатра БССР тав. **Рахленка.** — Зараз мы маем усе магчымасці паказаць сваё мастацтва, прадэманстраваць росквіт беларускай социялістычнай культуры перад усім Совецкім Саюзам, правесці дэкаду ў Маскве.

У часе дэкады беларускага мастацтва ў Маскве павінны паказаць свае лепшыя работы і драматычныя тэатры. Абвяшчаецца соцыялістычнае спаборніцтва паміж тэатрамі БССР з тым, каб пераможца ў гэтым спаборніцтве—лепшы тэатр—атрымаў права паехаць у Маскву.

Тав. Рахленка адзначае:

— Калі наш тэатр у гэтым творчым спаборніцтве выйдзе пераможцам, мы пакажам у Маскве 5 спектакляў: «Кацярыну Жарнасек» М. Клімковіча, «Салавей» З. Бядулі, «Бацькаўшчыну» К. Чорнага — п'есы аб гераічным мінулым нашага народа, «Партызаны» К. Крапівы — п'есу, якая адлюстроўвае барацьбу беларускага народа супроць белапольскіх акупантаў, і п'есу, якая пакажа шчаслівае жыццё і гатоўнасць да абароны народаў Совецкай Беларусі. Над стварэннем апошняй п'есы тэатр разам з драматургамі працуе зараз.

Рэжысёр Віцебскага тэатра тав. **Малчанаў** рэзка крытыкуе Упраўленне па справах мастацтваў, якое мала звязана з тэатрамі БССР, мала дапамагае тэатрам у іх творчай рабоце. Ён гаворыць, што ў Упраўленні працуюць малакваліфікаваныя людзі, як тав. Любамірскі, якія няздольны прааналізаваць творчую работу тэатра і дапамагчы яму. Трэба больш звярнуць увагі, — гаворыць тав. Малчанаў, — на якасць спектакля, на адзінства ансамбля. Трэба больш клапаціцца пра ўзбагачэнне тэатра тэхнічным абсталяваннем.

Аб неабходнасці прыцягнення да работы па афармленню спектакляў у нашых тэатрах беларускіх мастакоў гаварыў мастак тав. **Малкін.**

Крытыкуе работнікаў Упраўлення па справах мастацтваў, якія бездапаможны кіраваць тэатрамі, дапамагаць творчаму росту іх, і актор Яўрэйскага тэатра тав. **Каган.** Ён адзначае таксама цяжкія ўмовы работы Яўрэйскага тэатра БССР зараз.

Рэжысёр тав. **Баратаў,** які запрошан для пастаноўкі оперы «Міхась Падгорны» і балета «Салавей», спыняецца на тым, што ў Тэатры оперы і балета адсутнічаюць патрэбныя творчыя кадры для здзяйснення гэтых пастановак. Нехапае музыкантаў, спевакоў. Памяшканне Опернага тэатра ў Менску, якое ў хуткім часе будзе закончана, не дазволіць распачаць працу з-за таго, што месца для аркестра не адпавядае патрабаванням тэатра. Гэта неабходна ўлічыць і зараз-жа выправіць.

Аб неабходнасці знаходзіць таленты ў гуртках самадзейнасці, выхоўваць іх, папаўняць тэатры лепшымі прадстаўнікамі мастацкай самадзейнасці гаворыць тав. **Кац,** работнік аддзела мастацтваў Гомельскага аблвыканкома.

Рэжысёр Беларускага драматычнага тэатра БССР тав. **Зораў** заклікае ліквідаваць раз'яднанасць тэатральных калектываў, заклікае да сумеснай, агульнай працы, узаемнай творчай дапамогі па стварэнню спектакляў, вартых быць паказанымі ў Маскве. Патрэбна ўзняць культуру нашых спектакляў і дабіцца таго, каб не толькі добра выконвалі свае ролі галоўныя выканаўцы, а выдатна праходзілі, пакідаючы вялікае ўражанне, масавыя сцэны.

Крытыкуе работу Саюза кампазітараў, адсутнасць увагі з боку саюза да арганізацыі творчай працы кампазітараў тав. **Палонскі.**

Тав. **Мулер,** якому разам з тав. Баратавым даручана пастаноўка балета «Салавей», патрабуе павялічыць балетны ансамбль Тэатра оперы і балета. Ён адзначае, як станоўчы факт тое, што лепшыя майстры рускай сцэны прыцягваюцца да работы ў галіне тэатральнага мастацтва БССР.

Адсутнасць ведання справы, культуры ў рабоце, сувязі з тэатрамі работнікаў Упраўлення па справах мастацтваў адзначае тав. **Кучар.**

Кампазітар тав. **Любан** рэзка крытыкуе даклад тав. Патапейкі за несамакрытычнасць і неканкрэтнасць. Ён адзначае, што Упраўленне не мае працаздольнага штата, што работнікі Упраўлення (т.т. Уханаў, Любамірскі) не могуць весці даручаныя ім справы з-за непадрыхтаванасці і таму не карыстаюцца аўтарытэтам.

Аб большай увазе да выхавання вакальных кадраў у Кансерваторыі, неабходнасці даць маладым вакалістам для творчай вучобы беларускія песні і тэксты песень народаў СССР на беларускай мове, — гаворыць выкладчык кансерваторыі тав. **Ціханаў.**

Дырэктар Філармоніі тав. **Прагін** адзначае слабае кіраўніцтва Упраўлення па справах мастацтваў мастацкімі калектывамі.

Рэжысёр Беларускага драматычнага тэатра тав. **Літвінаў** указвае на адсутнасць у дакладзе тав. Патапейкі дакладнага плана правядзення дэкады. Тав. Літвінаў прапануе стварыць пры Упраўленні совет, куды ўвойдуць творчыя работнікі мастацтва. Совет павінен будзе ўважліва праглядзець усе пастаноўкі, вартыя паказу, і адабраць самае лепшае.

Тав. **Дарвішаў** прапануе склікаць нараду кампазітараў і нараду драматургаў і лібрэтыстаў, на якіх абмяркаваць пытанні стварэння новых твораў да дэкады.

Тав. **Клімковіч,** спыніўшыся на ўдзеле пісьменнікаў і драматургаў у падрыхтоўцы дэкады, абяцае ад імя Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР аказаць тэатрам максімальную дапамогу.

Тав. **Архіпаў** (Тэатр оперы і балета) адзначае, што работа па пастаноўцы опер «Міхась Падгорны» і «Дрыгва» па віне кіраўніцтва тэатра належным чынам не разгорнута.

Тав. **Бары** (дырыжор хора Філармоніі) адзначае недастатковую ўвагу нарады да пытанняў музыкі. Трэба паказаць працоўным Масквы і ўсяго Саюза ССР росквіт беларускай музыкі, беларускіх народных песень, беларускага фальклору. Слаба працуе ў гэтым напрамку Саюз кампазітараў. Музыкальны сектар Упраўлення па справах мастацтваў — пустое месца.

Тав. **Багатыроў** ставіць пытанне аб недапушчальных агіднасцях, якія твораццца ў Тэатры оперы і балета і якія прывялі да вялікага прарыву ў творчай рабоце. Тав. Багатыроў патрабуе змены мастацкага кіраўніцтва тэатра і стварэння здаровых умоў для паспяховай работы.

Тав. **Скальскі** (Віцебск) адзначае, што на нарадзе работнікаў мастацтваў прысутнічае вельмі мала пісьменнікаў і драматургаў. — Тав. Патапейка, — адзначае ён, — у сваім дакладзе нічога не сказаў аб тым, што збіраецца рабіць Упраўленне па справах мастацтваў для арганізацыі сумеснай дружнай работы пісьменнікаў і работнікаў мастацтваў.

Кампазітар **Шчэглоў** падрабязна разбірае, наколькі нашы тэатры і іншыя калектывы гатовы да дэкады, і робіць вывад, што работа толькі пачынаецца. Тав. Шчэглоў прапануе напярэдадні дэкады арганізаваць агляд беларускага мастацтва.

Кампазітар тав. **Пукст** спыняецца на шматлікіх недахопах работы Саюза кампазітараў. У сувязі з падрыхтоўкай да дэкады тав. Пукст рэкамендуе наладзіць конкурс на масавую песню, а таксама арганізаваць праслуханне і адбор лепшых твораў кампазітараў. —

Рэжысёр Беларускага дзяржаўнага тэатра тав. **Саннікаў** заклікае звярнуць сур'ёзную ўвагу на культурную падачу спектакля, на культуру мовы.

Тав. **Дзянісаў** (саліст Оперы) адзначае недахоп кваліфікаваных кадраў у Тэатры оперы і балета і ўказвае, што віна за гэта цалкам падае на цяперашняга мастацкага кіраўніка — дырэктара тав. Ярыкава, які выжыў з тэатра рад каштоўных работнікаў.

Дырэктар Белдзяржтэатра тав. **Гайдарын** прапануе дакладна ўстанавіць, якія калектывы паедуць на беларускую дэкаду ў Маскву, і абкружыць гэтыя калектывы неабходнымі клопатамі і ўвагай.

Тав. **Дорскі** (Віцебскі тэатр) папракае Упраўленне па справах мастацтваў за адсутнасць ўвагі да пісьменнікаў і драматургаў. Шмат гавораць аб тым, што няма п'ес на сучасную тэматыку, але нічога не зроблена для таго, каб дапамагчы пісьменнікам напісаць такія п'есы.

Тав. **Юдзелевіч** (Дзіцячы тэатр БССР), разбіраючы становішча ў Яўрэйскім тэатры, Дзіцячым тэатры, Тэатры оперы і балета, Віцебскім тэатры і інш., робіць вывад, што становішча ў гэтых тэатрах вельмі цяжкае, між тым тов выступленняў кіраўнікоў Упраўлення па справах мастацтваў спакойны і благадушны.

Прадстаўнік аддзела культасветработы ЦК КП(б)Б тав. **Аронаў** адзначае, што пастанова ЦК КП(б)Б і СНК БССР аб правядзенні дэкады беларускага мастацтва ў Маскве ўскладае на работнікаў мастацтва вялікія і адказныя задачы. Дэкада з'явіцца дэманстрацыяй перамог ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі, дэманстрацыяй росту соцыялізма ў нашай краіне. Таму ўся творчая работа павінна быць паказана на высокім ідэйна-мастацкім узроўні. Таварыш Сталін удзяляе беларускаму народу выключныя клопаты і ўвагу і мы павінны апраўдаць гэтую ўвагу.

Няправільная думка, што да дэкады павінны рыхтавацца паасобныя тэатры. Да дэкады павінны рыхтавацца без выключэння ўсе калектывы, усе кампазітары, пісьменнікі.

Дырэктар Кансерваторыі тав. **Гантман** адзначае, што Беларуская дзяржаўная кансерваторыя здолее паслаць на дэкаду групу вакалістаў, піяністаў і выканаўцаў на народных інструментах. Апрача таго, Кансерваторыя вылучыць каля 30 цымбалістаў, каля 40 вакалістаў і іншых выканаўцаў для ўзмацнення хора Опернага тэатра і калектываў Філармоніі.

Дырэктар Тэатра оперы і балета тав. **Ярыкаў** у сваім выступленні спасылаўся на цяжкія ўмовы работы, у якіх знаходзіцца тэатр, аднак не даў адказу на хвалюючыя нараду пытанні аб дрэнным становішчы ў ім.

Заслухаўшы інфармацыі прадстаўнікоў тэатраў — Беларускага драматычнага, Віцебскага, Оперы і балета, Дзіцячага і Полацкага калгасна-соўгаснага, а таксама дырэктароў Філармоніі і Кансерваторыі, нарада адзначыла, што мастацкія калектывы яшчэ не выканалі свайго асноўнага абавязку — не разгарнулі адпаведнай шырокай, штодзённай агітацыі і прапаганды як унутры калектываў, так і сярод выбаршчыкаў. Нарада патрабуе ад усіх калектываў работнікаў мастацтваў паставіць работу сярод выбаршчыкаў і агітацыю сродкамі мастацтваў на першае месца і для гэтага мабілізаваць усе сілы і сродкі.

Нарада актыва работнікаў мастацтваў БССР паслала прывітанні першым кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР — вялікаму Сталіну і яго слаўным саратнікам — таварышам Молатаву, Варашылаву, Калініну, Кагановічу, Ежову, Мікаяну, Андрэеву і Жданаву.

Нарада прыняла зварот да ўсіх работнікаў мастацтваў БССР, у якім заклікае іх актыўна ўключыцца ў падрыхтоўку да дэкады беларускага мастацтва ў Маскве — дэманстрацыі бліскучага росквіту соцыялістычнага мастацтва Совецкай Беларусі.

Першыя экспанаты народнай творчасці на Усесаюзную сельскагаспадарчую выстаўку

У Дом народнай творчасці БССР пачалі паступаць экспанаты народнай творчасці для Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі ў Маскве. У пераважнай большасці пакуль-што паступаюць экспанаты ткацтва і вышыўкі. Усяго паступіла звыш 40 экспанатаў. Асабліва вылучаецца сваёй работай калгасніца сельска-гаспадарчай арцелі імя 1 мая Уздзенскага раёна **Марыя Андрэеўна Ліпай,** прэміраваная СНК БССР за ўдзел у Першай усебеларускай выстаўцы народнай творчасці. Тав. Ліпай прывезла 10 вытканых коўдраў, паясы, ручнікі, абрусы—усяго звыш 20 экспанатаў. Уся яе работа адзначаецца тонкасцю выканання, характэрнымі народнымі рысункамі, арнаментам з раслінным і графічным малюнкам. Зараз Марыя Ліпай прыступіла да вялікай работы—яна будзе ткаць партрэт таварыша **Сталіна.**

З іншых экспанатаў трэба адзначыць вельмі цікавую і арыгінальную па канструкцыі драўляную шкатулку, зробленую калгаснікам **Міхасём Тамашовічам Глебка** з калгаса «Комінтэрн» Уздзенскага раёна. Шкатулка зроблена з розных парод дрэва—бярозы, клёна, ігрушы і яблыні. Апрача гэтага, тав. Глебка рыхтуе для выстаўкі пісьмовы прыбор з дрэва, афармлены ў выглядзе Крэмлёўскай сцяны з вежамі.

—О—

Вялікая цяга ў тэатральнае вучылішча

З часу першага паведамлення аб арганізацыі ў Менску тэатральнага вучылішча — за месяц — дырэкцыя вучылішча атрымала з розных месц БССР і іншых рэспублік (Украіны, Узбекістана) шматлікія запытанні аб падрабязнасцях прыёму ў вучылішча і іспытах. Усяго атрымана каля 300 пісем.

Піша, галоўным чынам, вучнёўская моладзь 8—9 класаў, у пераважнай большасці калгаснікі. Пішуць чырвонаармейцы і малодшыя камандзіры Чырвонай Арміі, рабочыя прамысловых прадпрыемстваў—удзельнікі мастацкай самадзейнасці і інш.



Пры мозырскім Доме піонераў арганізаваны гурткі мастацкай самадзейнасці. **НА ЗДЫМКУ:** юныя мастакі Т. Івашкевіч, З. Цэльнікер і В. Патрэў на занятках гуртка.



Сцэна з спектакля «Цыганы» ў пастаноўцы цыганскага тэатра «Ромэн». **НА ЗДЫМКУ:** арт. Л. Чорная ў ролі Земфіры, арт. В. Кісілеў у ролі Алеко, арт. І. І. Ром-Лебедзеў у ролі старога цыгана.

„ЦЫГАНЫ“

Пастаноўка Маскоўскага цыганскага тэатра «Ромэн»

Сваю апошнюю работу — спектакль «Цыганы» паказаў у Менску Дзяржаўны Маскоўскі цыганскі тэатр «Ромэн».

У мінулым бяспраўны і прыгнятаемы, цыганскі народ у Совецкім Саюзе знайшоў сваю сапраўдную бацькаўшчыну. На фабрыках і заводах, на соцыялістычных палях працуюць зараз працоўныя цыганы і пры братняй дапамове ўсіх народаў Совецкага Саюза будуюць сваю соцыялістычную культуру. Паказчыкам развіцця цыганскага тэатральнага мастацтва з'яўляецца тэатр «Ромэн».

Спектакль «Цыганы» створан паводле выдатнейшай аднайменнай паэмы генія рускай літаратуры А. С. Пушкіна. Уключэнне тэатрам «Ромэн» у свой рэпертуар твора А. С. Пушкіна—не выпадковасць. Цыганскі тэатр вучыцца на лепшых здабытках вялікай рускай культуры і ў гэтым заруka яго творчага росту, узбагачэння культурай і авалодання майстэрствам.

У спектаклі «Цыганы» няма іллжывай экзотыкі, таннай напышлівасці. Таленавіты малады калектыў тэатра проста і шчыра даносіць да гледача пушкінскі тэкст, карціны і вобразы цудоўнай пушкінскай паэмы.

Вось цыганскі табар, яркі малюнак жыцця якога дадзен у паэме Пушкіным.

Глядач бачыць: цыганы
...Над ракой...
У шатрах палапленых начуюць.
Глядач чуе.
І крык дзяцей, і спеў жанок,
І звон кавадла ля дарогі.

Строга прытрымліваючыся тэкста, тэатр інсцэніруе паэму. Але дакладнае следаванне тэксту, старанное капіраванне дэталей, дадзеных у паэме, не засушвае спектакля. Ён дыхае свежасцю, сапраўднай паэтычнасцю і цудоўным лірызмам,—тым, што характэрна і для паэмы. Простымі і сціпымі сродкамі акторы перадаюць абаяльнасць паэтычных пушкінскіх вобразаў.

Прыходзіць у табар Алеко, якога «праследуе закон». Алеко—складаны вобраз. Ён выкрывае сучаснае яму буржуазна-дваранскае грамадства, з пагардай гаворыць аб «няволі душных гарадоў», дзе людзі:

Кахаць саромяцца, гандлююць
Там волю сваёй, мой друг,
З пракляццем ідалам шануюць,
Каб даў ім грошы ды ланцуг.

Разам з гэтым Алеко з'яўляецца носьбітам многіх тыповых рысаў людзей грамадства, якое ён асуджае і крытыкуе. Ён—чалавек, які «для сябе шукае толькі волі». І цыганы супроцьстаяць Алеко і яго грамадству са сваімі першабытнымі законамі, звычкамі і соцыяльным укладам, высокімі маральнымі якасцямі свайго народа — велікадушнасцю і гуманізмам, вялікай і палкай любоўю да волі.

Удумліва раскрывае ў спектаклі вобраз Алеко актор В. С. Кісілеў. Але зусім непатрэбна было надаваць Алеко рысы знешняга падабенства з Пушкіным.

Таленавітая актрыса Ляля Чорная з вялікай цяплынёй і непасрэднасцю стварае яркі вобраз дачкі старога Земфіры.

Стары цыган — прапаведнік ісціны носьбіт народнай мудрасці, лепшых рысаў свайго народа—рысаў, якія супроцьстаяць еўрапейскай цывілізацыі. Для раскрыцця гэтага вобраза актор І. І. Ром-Лебедзеў знайшоў правільны шлях—стрыманай манерай ігры і вялікай увагай да пушкінскага слова.

Добра выконваюць свае ролі, запамінаецца актор С. Ф. Шышкоў (малады цыган), актрыса М. В. Скварцова (старая цыганка).

Можна згадзіцца са спалучэннем у інсцэніроўцы цыганскай мовы з рускай. Але наўрад ці трэба было поруч з цыганскімі народнымі песнямі ўводзіць у інсцэніроўку раманс «Чорная шаль».

Народныя танцы і песні ўдала спалучаны з тэкстам, з развіццём інсцэніроўкі. Дапамагае раскрыццю карцін і вобразаў паэмы і музыка С. М. Бугачэўскага.

«Цыганы» ў тэатры «Ромэн» (пастаноўка П. С. Саратаўскага)—культурны спектакль, які даносіць да гледача чароўную прастату, яркасць і абаяльнасць пушкінскай паэмы.

Р. ЮРЫН.

В. Г. КАРАЛЕНКА

(85 год з дня нараджэння)

«Чалавек створан для шчасця, як птушка для палёту» — гаворыць адзін з герояў Караленкі ў апавяданні «Парадокс». І гэтыя словы гучаць як сцверджанне высокай чалавечай годнасці, пераклікаючыся з вядомымі горкаўскімі словамі «чалавек, гэта гучыць горда».

Крыштальная сумленнасць і шчырасць гэтага благароднага пісьменніка — чалавекалюба, вядома, не ўзвышалася да разумення пролетарскага гуманізма, аднак да апошніх дзён свайго жыцця (памёр Караленка ў 1921 годзе) Уладзімір Галакціёнавіч заставаўся сумленным і шчырым пісьменнікам, а яго голас гучаў як заклік да лепшага светлага жыцця, як рашучы пратэст супроць зняваг чалавечай асобы, супроць самаўладства і эксплаатацыі.

А. М. Горкі, які вельмі любіў творчасць Караленкі за яе праўдзівасць, пісаў аб ім: «Мне асабіста гэты вялікі і прыгожы пісьменнік сказаў аб рускім народзе шмат такога, чаго да яго ніхто не ўмеў сказаць». Праўдзівасць, глыбокае веданне жыцця, якое папаўнялася бясконцымі вандраваннямі пісьменніка па самых глухіх кутках Расіі ў часе яго шматлікіх ссылак і рэпрэсій, яркі прыродны талент мастака — усё гэта вылучае Караленку, як выдатнага майстра мастацкага слова ў рускай літаратуры.

Сваю пісьменніцкую дзейнасць Караленка пачаў як карэспандэнт, і на працягу дзесяцігоддзяў ён не спыняў журналісцкай работы, супрацоўнічаючы ў большасці газет і журналаў таго часу, пішучы на самыя рознастайныя тэмы. Ён не грэбаваў ніякімі фактамі, яго цікавіла літаральна ўсё, і ўсюды ён праяўляў сваю дапытлівасць, выказваў смелае слова праўды. Ад скромнай газетнай карэспандэнцыі на выпадковую тэму Караленка пераходзіў да публіцыстыкі на буйныя палітычныя і соцыяльныя тэмы. Так з паасобных карэспандэнцый аб голадзе ў Лукаянаўскім паведзе вырасла вядомая вялікая кніга «У галодны год» (1893 год), заслужана атрымаўшая назву «Энцыклапедыі галоднай Расіі». У 1895 годзе Караленка выступае абаронцам на судовым працэсе па прагучэўшай тады па ўсёй Расіі так-званай мултанскай справе, калі царскі ўрад ілжыва абвінаваціў вацякоў у рытуальных чалавечых афяра-прынашэннях. У 1903 годзе ён друкуе рад артыкулаў, поўных страшнага пратэсту супроць яўрэйскіх пагромаў у Кішынёве, піша аб гэтым некалькі вельмі яркіх апавяданняў. А пазней, у часе вядомай справы Бейліса, учыненай чорнай зграяй сталыпінскіх рэакцыянераў, голас пісьменніка гучыць на ўсю Расію, як рашучы пратэст супроць нечуванага чалавеканенавісніцтва.

Асобную групу літаратурных работ Караленкі складаюць яго гістарычныя нарысы. Жывучы ў Ніжнім-Ноўгарадзе, пісьменнік сярод кіпучай грамадскай дзейнасці знаходзіў час працаваць у ніжагародскай вучонай архіўнай камісіі, разбіраць і апісваць пыльныя скруткі старажытных папер. У часе паездкі на Урал ён зноў уважліва вывучае мясцовыя архівы. У выніку гэтых вывучэнняў паяўляецца «Легенда аб цару і дзекабрысту» і рад надзвычай каштоўных у навукова-літаратурным сэнсе гістарычных нарысаў. Вядомае гістарычнае значэнне маюць і ўспаміны Караленкі аб «нябожчыках», пісьменніках, з якімі ён быў блізка знаёмы: Чэрнышэўскім, Міхайлоўскім, Глебе Успенскім і Чэхаве.

Аднак, асабліва ярка праявіўся талент мемуарыста ў манументальным творы Караленкі «Гісторыя майго сучасніка», над якім пісьменнік працаваў да апошніх дзён жыцця. Наколькі велічным быў замысел і размер твора, паказвае тое, што ў чатырох напісаных томах Караленка паспеў давесці сваю біяграфію толькі да звароту ў 1885 годзе з ссылкі ў Ніжні-Ноўгарад. У «Гісторыі майго сучасніка» побач з разгортваннем багацейшых аўтабіяграфічных матэрыялаў Караленка расказвае аб выдатных людзях і буйнейшых падзеях свайго часу.

Улюбёнай літаратурнай формай Караленкі было тое, чым ён сам назваў свой першы зборнік «Нарысы і апавяданні». Аповесць напісаў ён толькі адну: «Сляпы музыкант», а другую вялікую сваю рэч — «Без языка» — сам назваў апавяданнем. Малыя эпічныя формы ён любоўна распрацоўваў і дасягнуў у гэтым бліскучага майстэрства.

У творчым развіцці Караленкі цяжка заўважыць якія-небудзь перыяды. Яго мастацкая манера заставалася нязменнай дзесяткамі год. Аднак, у яго лёгка заўважыць іншую асаблівасць. Гэта ўплыў на яго творчасць бытавых умоў. Так вылучаем мы яго валынскія апавяданні: «Лес шуміць», «Парадокс», «Эпізоды з жыцця шукальніка», «Судны дзень»; румынскія: «Над ліманам», «Нашы на Дунаі», «Нірвана», «Турчын і мы». Паездка ў Амерыку ў 1893 годзе дала пісьменніку багата ўражанняў, якія таксама адлюстраваны ў яго найбольш буйных творах: «Без языка», «Бойка ў доме», «У барацьбе з д'яволам». Жыццё ў Ніжнім-Ноўгарадзе, паездкі на Волгу і Паволжжа далі таксама багацейшы матэрыял для апавяданняў «Рака гуляе», «У пустынных месцах», «За іконай», «Птушкі нябесныя», «На Волзе» і шмат інш. Але самую яркую групу ўтвараюць, вядома, сібірскія апавяданні: «Сон Макара», «У падследным аддзяленні», «Нарысы сібірскага турыста», «Мароз», «Апошні промень», «Марусіна заімка», «Чэркес» і «Ат-Даван». Праўда, усе гэтыя групы, утвораныя па біяграфічнаму прызнаку, не заўсёды злучаны з храналагічнай сумежнасцю.

У сваёй творчасці Караленка быў пранікілівым рэалістам, які дасканала ведаў павятовую Расію, жыццё жабрацкай вёскі, псіхалогію і норавы народа. Аб адным вобразе, створаным Караленкам у апавяданні «Рака гуляе», вельмі ярка сказаў Горкі: «Праўда, выказаная вобразам Цюліна,—велізарная праўда, таму што ў гэтай фігуры нам дадзен гістарычна правільны тып велікаруса».

Калі пісьменнікі народніцкага толку, схаваючы і замазваючы соцыяльныя супярэчнасці вёскі, імкнуліся сцвярджаць рэакцыйную тэорыю аб асобным гістарычным шляху, па якім нібыта пойдзе Расія і абміне перыяд капіталізма, дык Караленка ў сваіх апавяданнях пераканаўча і праўдзіва раскрывае гэтыя соцыяльныя супярэчнасці, паказвае сапраўдную рэчаіснасць. Караленку былі чужымі народніцкія ілюзіі. Ён рашуча высмейваў імкненні некаторых белетрыстаў стварыць «шакаладнага мужыка». Ён заклікаў устрымлівацца ад такога ўяўлення, раіў вывучаць сапраўднага, непрыдуманага селяніна. «Мужыка, адзінага і нераздзельнага, проста мужыка—няма: ёсць Фёдары, Іваны, беднякі, багацеі, жабракі і кулакі, дабрадзейныя, прыстойныя, клапатлівыя і п'яніцы, жывучыя на поўным надзеле і дараваныя, з надзелам у адзін лапаць, гаспадары і работнікі» — пісаў ён. І ў сваім цудоўным апавяданні «Сон Макара» пісьменнік намаляваў вобраз прыцўшанага галечай селяніна, якога «ганялі старасты і старшыны, засядацелі і спраўнік, патрабуючы падатак, ганялі папы, ганяла галеча і голад».

Лірыка соцыяльнай няпраўды, балючае «грамадскае сумленне», лірыка свабоды і барацьбы за лепшае жыццё — гэтая асноўная рыса пісьменніка праходзіць праз усю яго творчасць. І ярчэй за ўсё адчувальна яна ў цудоўным «Сказанні аб Флоры і Менахеме». Гэтая лірычная паэма Караленкі з'яўляецца паэтычным водгуллем даўняй рэволюцыйнай барацьбы рускіх рэволюцыянераў. Напісанае ў 1886 годзе пасля 20 год напружанай гераічнай схваткі рускіх рэволюцыянераў з дэспатычнай уладай самадзяржаўя, пасля крушэння свабодалюбівых ідэй, насуперак пропаведзі талстоўскага непраціўленства, «Сказанне» прагучала не толькі жальбой аб горкіх стратах, але разам з гэтым і неастыўшым гневам барацьбы за свабоду. Глыбокім лірызмам прасякнуты ўвесь гэты твор. У фінале гэты лірызм у прамове Менахема, накіраванай да ціхамірных непраціўленцаў — есеяў, вырастае да самага высокага напружання: «Быць можа, мы, абаронцы свабоды, загінем, а вы застанецеся з дзецьмі і дзецьмі дзяцей. Тады, ціхамірныя есеі, ці не ўспомніце вы з удзячнасцю пра нас, мяцежных, наклікаўшых на сябе ўвесь гнеў гвалтаўнікоў і сваёй гібеллю купіўшых вам мір і спакой?.. Будзьце ўдзячны гінуўшым вы, ціхамірныя, захоўваючыя жыццё, таму, што ваша ціхамірнасць атрымоўвае цану толькі дзякуючы нашай непакорлівасці, а ваш спакой падобны кветкам, расцвіўшым на палях, удобраных нашай крывёю»...

Гэтыя сімвалічныя і алегарычныя разважанні лагічна выцякалі з душэўнага складу пісьменніка, з яго ідэалістычнага светапогляду. Але арыгінальны вялікі талент Караленкі, яго любоў да свабоды, глыбокая нянавісць да эксплаататараў, да самаўладства, яго крыштальная сумленнасць, чыстата і шчырасць — вось якасці, за якія любіць яго наш совецкі чытач, паважае ўвесь наш народ.

Ц. К.

Адказны рэдактар **І. ГУРСКІ.**

Друкарня «Звязды». Газета «Літаратура і мастацтва» выходзіць адзін раз у пяцідзёнку. Адрас рэдакцыі газеты: Менск, Савецкая, 76, Дом пісьменніка. Тэлефон 25-394.

Уп. Галоўлітбела № Г—4679.